ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 Г.
№ 18 (886) 2 — 8 МАЯ 2009 Г.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

С. 5

С. 6 — 7

С. 10 — 11

С. 8

"БЛІЦСІМФОНІЮ" РЭГІЁНАЎ СТВАРАЕ

"ФОТААРКЕСТР"

5 мая — Дзень друку

Фота Юрыя ІВАНОВА

Фотакарэспандэнты раённых газет працуюць у кожным са 118 рэгіёнаў Беларусі, фіксуючы знакавыя імгненні жыцця свайго любага краю. Сёлета ж агульнае сімфанічнае палатно, якое яны ствараюць, можна сімвалічна назваць "Прысвячэнне роднай зямлі". У Год роднай зямлі, напярэдадні Дня друку, фотарэпарцёры — на нашым здымку, вядома, толькі невялікая частка "аркестрантаў" гэтага зладжанага інфармкалектыву — сабраліся ў Мінску. З якой жа мэтай?

С. 2

Беларусь — Ватыкан:
рэчышча развіцця супрацоўніцтва

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка і Папа Рымскі Бенедыкт XVI.

У Папскай бібліятэцы ў Апостальскім палацы Ватыкана адбылася сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Папы Рымскага. Пра гэта паведамляе Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка спадзяецца на сустрэчу з Папам Рымскім Бенедыктам XVI у Беларусі, што і перадаў Пантыфіку пад час сустрэчы ў Ватыкане 27 красавіка.

“Калі вы знойдзеце час, мы сустрэнемся на беларускай зямлі, калі на тое будзе воля Божая”, — сказаў Кіраўнік дзяржавы.

Па заканчэнні сустрэчы Прэзідэнт і Пантыфік абмяняліся падарункамі: Папа ўручыў сувенірную манету, у сваю чаргу, Аляксандр Лукашэнка паднёс у якасці падарунка ікону работы беларускага майстра.

Беларусь і Ватыкан плануюць заключыць пагадненне аб супрацоўніцтве. Падрабязнасці падпісання дакумента абмяркоўваліся на сустрэчы Прэзідэнта нашай краіны Аляксандра Лукашэнкі з Дзяржсакратаром Яго Святасці Папы Бенедыкта XVI Кардыналам Тарчызіа Бертоне.

Тарчызіа Бертоне выказаў задавальненне развіццём двухбаковага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Ватыканам і падзякаваў Кіраўніку беларускай дзяржавы за садзейнічанне ў дзейнасці Рымска-каталіцкай Царквы ў Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка пад час гутарак з Папам Рымскім Бенедыктам XVI, Дзяржсакратаром Яго Святасці Папы Кардыналам Тарчызіа Бертоне абмеркаваў пытанні, што датычацца міжканфесійнага і міжкультурнага дыялога, тэмы міжнароднага характару, звязаныя з рухам свету і прагрэсу чалавецтва, некаторыя ўнутраныя пытанні краіны, тэмы, датычныя каталіцкай царквы ў Беларусі.

***

Падводзячы вынікі свайго візіту ў Італію, Аляксандр Лукашэнка зазначыў, што прапанаваў правесці ў Беларусі сустрэчу Папы Рымскага Бенедыкта XVI і Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірылы. “Я сказаў на сустрэчы, што сёння ёсць унікальны шанц зблізіць пазіцыі, каб на самым версе Папа Рымскі і Патрыярх маглі сустрэцца і абмеркаваць агульныя праблемы. Калі такая сустрэча адбудзецца, то няхай яна пройдзе ў Беларусі, таму што яна — не толькі цэнтр Еўропы, але і краіна, дзе судакранаюцца дзве канфесіі — праваслаўе і каталіцызм”, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Кіраўніка дзяржавы, Папа Рымскі ведае аб гэтай ідэі. “Я бачыў яго зацікаўленасць, — адзначыў Прэзідэнт, — і ён мне сказаў: Гасподзь, магчыма, адкрые гэтыя дзверы, і мы ў хуткім часе сустрэнемся”.

Фота Мікалая ПЯТРОВА, БелТА

Дзве асноўныя тэмы на выстаўцы “СМІ ў Беларусі” —

5 мая — Дзень друку

65-годдзе вызвалення Беларусі і Год роднай зямлі

З 5 па 8 мая ў Нацыянальнай выставачнай зале “БелЭКСПА” пройдзе XIII Міжнародная спецыялізаваная выстаўка “СМІ ў Беларусі”. Арганізатары — Міністэрства інфармацыі, Міністэрства замежных спраў, Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, Беларускі саюз журналістаў, Саюз выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку. Выстаўка прысвечана 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Году роднай зямлі. 29 красавіка ў Прэс-цэнтры Дома прэсы з гэтай нагоды адбылася прэс-канферэнцыя з удзелам першага намесніка міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ліліі Ананіч.

Мэта форуму — пашырэнне інфармацыйнай прасторы Рэспублікі Беларусь, паглыбленне міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы мас-медыя, папулярызацыя беларускіх сродкаў масавай інфармацыі, павелічэнне тэле- і радыёаўдыторыі айчынных СМІ.

У выстаўцы прымуць удзел друкаваныя і электронныя СМІ, інфармацыйныя агенцтвы і інтэрнет-правайдэры, распаўсюджвальнікі друкаванай прадукцыі, рэкламныя арганізацыі, выдавецтвы і друкарні. Сярод экспанентаў — прадстаўнікі не толькі Беларусі, але і Расіі, Украіны, Кітая, Ізраіля, Швейцарыі, Францыі, Велікабрытаніі, Азербайджана... Удзельнікаў чакае насычаная праграма: штодзённыя прэзентацыі газет і часопісаў, тэле- і радыёканалаў, інтэрнет-сайтаў, а таксама творчыя сустрэчы, конкурсныя праграмы, майстар-класы, дыспуты. Будзе дзейнічаць экспазіцыя, прысвечаная беларускай журналістыцы гадоў Вялікай Айчыннай вайны.

Па традыцыі, у выставачныя дні будуць названы лепшыя айчынныя перыядычныя выданні і лепшыя журналісты Беларусі — пераможцы V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ “Залатая ліцера”.

Як паведамляе “К” кансультант упраўлення друкаваных СМІ і знешніх сувязей Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Галіна Гусакова, на ўдзел у Нацыянальным конкурсе даслана 246 заявак. Як і ў папярэднія гады, самай папулярнай аказалася конкурсная намінацыя “Лепшы творчы праект года”. Сёлета свае праекты на разгляд журы прадаставілі 44 рэгіянальныя выданні і 38 рэспубліканскіх. Перамогуць, натуральна, лепшыя з лепшых. Не менш папулярнымі застаюцца і персанальныя намінацыі. У гэтым годзе будуць вызначаны лепшыя рэпарцёр, аглядальнік, фотакарэспандэнт, афарміцель-дызайнер беларускіх СМІ. Словам, 24 “Залатыя ліцеры” чакаюць сваіх уладальнікаў.

Адной з важных падзей XIII Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі “СМІ ў Беларусі” стане IV Беларускі інфармацыйны форум “СМІ ў эпоху глабальнага эканамічнага крызісу. Фарміраванне сацыяльных установак насельніцтва”. Форум пройдзе 6 — 7 мая ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

“Культура” таксама чакае сваіх чытачоў ля стэнда на выстаўцы “СМІ ў Беларусі”. Прыходзьце, шаноўныя, — будзем рады вас вітаць!

Упэўненасць у заўтрашнім дні

Штогод Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ў дні чарговай гадавіны трагедыі на Чарнобыльскай АЭС наведвае рэгіёны, якія пацярпелі ў выніку гэтай аварыі. Як паведамляе Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, сёлета Кіраўнік дзяржавы знаёміўся з сітуацыяй на Гомельшчыне.

З 21 раёна гэтай вобласці ў выніку аварыі на ЧАЭС пацярпела 18. Толькі ў 2008 годзе на пераадоленне наступстваў аварыі па дзяржпраграме было накіравана амаль 700 млрд. рублёў.

Як адзначыў Прэзідэнт пад час наведвання Лоеўскага раёна, многае робіцца для навядзення парадку на зямлі, забеспячэння камфортных умоў жыцця для дзесяткаў тысяч людзей, што пражываюць тут. Але самая галоўная задача, якую яшчэ трэба вырашыць, — гэта, безумоўна, забеспячэнне высокай эфектыўнасці эканомікі рэгіёна. У Гомельскай вобласці ёсць таксама раёны, падкрэсліў Кіраўнік дзяржавы, што маюць добры турыстычны патэнцыял, які неабходна выкарыстоўваць.

***

У другі дзень рабочай паездкі Аляксандр Лукашэнка наведаў гарадскі пасёлак Камарын Брагінскага раёна, дзе азнаёміўся з ходам веснавых палявых работ як у вобласці, так і ў цэлым па рэспубліцы.

Як падкрэсліў Прэзідэнт, адраджэнне забруджаных тэрыторый становіцца першачарговай задачай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што ўсе праграмы, накіраваныя на аднаўленне гэтага рэгіёна, будуць фінансавацца ў першую чаргу. Пры гэтым Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на тым, што пытаннем нумар адзін застаецца бяспека грамадзян.

Як лічыць Прэзідэнт, добрым паказчыкам таго, што адраджаць гэты край неабходна, з’яўляецца прыток насельніцтва: у мінулым годзе ў гэты рэгіён прыехала на паўтысячы чалавек больш, чым выехала, прычым асноўную масу складае моладзь ад 15 да 29 гадоў.

***

Чарговым пунктам у праграме знаходжання Прэзідэнта на Гомельшчыне стала наведванне Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка.

Пазней на цэнтральнай плошчы Камарына адбыўся мітынг-рэквіем, прысвечаны 23-й гадавіне аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Дзяржава, нягледзячы на сусветны фінансавы крызіс, выдзеліць дастаткова сродкаў на стварэнне дастойных умоў жыцця для людзей на забруджаных тэрыторыях, падкрэсліў Прэзідэнт у сваім выступленні.

Як адзначыў Прэзідэнт, матэрыяльны ўрон у выніку гэтай трагедыі супастаўны са стратамі Вялікай Айчыннай вайны. 619 беларускіх вёсак знішчылі фашысты, а ў выніку чарнобыльскай катастрофы краіна страціла 485 паселішчаў. У Брагінскім раёне з прычыны аварыі перасталі існаваць 42% населеных пунктаў, на 40% скарацілася колькасць жыхароў. За ўсе мінулыя гады Беларусь выдаткавала на мэты ліквідацыі наступстваў трагедыі 20 млрд. долараў.

Прэзідэнт выказаў сардэчную ўдзячнасць людзям, якія стойка вытрымалі ўсе выпрабаванні наступстваў тэхнагеннай катастрофы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, на вырашэнне чарнобыльскіх праблем накіравана чацвёртая па ліку Дзяржаўная праграма па пераадоленні наступстваў аварыі на ЧАЭС да 2010 года. Істотна дапамагае аднаўленню Палесся выкананне маштабных праграм адраджэння вёскі і развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што з гэтага года пачнецца імклівае адраджэнне забруджаных радыенуклідамі тэрыторый.

Цяпер важна не проста мінімізаваць наступствы Чарнобыля, а стварыць нармальныя вытворчыя і побытавыя ўмовы, каб людзі былі ўпэўнены ў заўтрашнім дні, лічыць Прэзідэнт. Ён адзначыў наяўнасць яшчэ нявырашаных праблем, якіх, тым не менш, з кожным годам становіцца ўсё менш.

Аляксандр Лукашэнка запаліў Вечны агонь каля помніка ў гонар воінаў-вызваліцеляў, пагутарыў з мясцовымі жыхарамі. Ад імя Кіраўніка дзяржавы ў падарунак жыхарам Камарына быў перададзены новы пасажырскі аўтобус МАЗ.

Аб’ектыўнае “я”

(Заканчэнне. Пачатак на стар 1.)

Дык як жа трапілі фотакарэспандэнты рэгіянальнай прэсы ў склад нашага “фотааркестра” на першай паласе? Аказваецца, з’яднала іх усіх імкненне да самаўдасканалення.

У Інстытуце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта на факультэце павышэння кваліфікацыі журналісцкіх кадраў рэгулярна праводзяцца курсы, у тым ліку і для фотакарэспандэнтаў. Апошнюю дэкаду красавіка 16 майстроў аб’ектыва з раённых газет Беларусі навучаліся па тэме “Сучасная фотажурналістыка: тэндэнцыі і перспектывы”. За гэты час было праведзена 32 акадэмічныя гадзіны лекцый, 30 — практычных і выязных заняткаў, адбыліся дзелавыя сустрэчы, майстар-класы, “круглыя сталы”, выязныя заняткі, гутаркі.

У рабоце курсаў прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, прафесарска-выкладчыцкі склад Інстытута журналістыкі БДУ, вядучыя беларускія фотажурналісты Юрый Іваноў, Віктар Стралкоўскі, Сяргей Плыткевіч, Яўген Пясецкі. Адзначым, што загадчык аддзела фотаілюстрацый “Культуры” Юрый Іваноў правёў заняткі па тэмах “Тэхніка рэпартажнай фатаграфіі. Складнікі прафесіяналізму”, “Фатаграфія мастацкая, пастановачная і рэпартажная”, “Рэпартажны псіхалагічны партрэт”, “Аўтарскае “я” ў жанры фатаграфіі. Праблема самавыражэння: ад фотаздымка да фотавыстаўкі”.

Зрэшты, самы час прадставіць і “аркестрантаў”, што трапілі ў аб’ектыў “К”. У першым радзе (злева направа) — Наталля Чэкан (Хойнікі), Вераніка Вішнеўская (Ашмяны), Сяргей Лазоўскі (Капыль); у другім — Аляксей Нарэйка (Гомель), Галіна Антонава (Смаргонь), Наталля Рыжкова (Талачын), Ларыса Салодкіна (Слуцк), Віктар Падута (Любань); у трэцім радзе — Алег Ігнатовіч (Мінск), Андрэй Бурэц (Шаркаўшчына), Канстанцін Кашкоў (Мазыр).

Рэдакцыя “Культуры” віншуе ўсіх сваіх калег з Днём друку! Жадае вострага пяра, пільнага аб’ектыва і аператыўнай працы!

Вялікі ўклад у развіццё краіны

Прэм’ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі па даручэнні Кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі ўручыў 24 красавіка ў Круглай зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі дзяржаўныя ўзнагароды заслужаным людзям краіны.

Усяго ў спісе ўзнагароджаных — 118 чалавек. Гэта кіраўнікі розных узроўняў прамысловых, будаўнічых і грамадскіх арганізацый, установаў адукацыі, аховы здароўя і культуры, прадстаўнікі авіяцыі, друку і “Белсаюздруку”, ваеннаслужачыя Узброеных Сіл, супрацоўнікі МУС, МНС, асобных органаў дзяржкіравання.

Сярод узнагароджаных дзеячаў культуры медалём Францыска Скарыны адзначана вядучы майстар сцэны Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра Галіна Лабанок.

Словы ўдзячнасці на цырымоніі былі сказаны Сяргеем Сідорскім на адрас вучоных, работнікаў культуры, прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі і выкладчыкаў. “Вы ўносіце вялікі ўклад у развіццё навукі, нацыянальнага мастацтва, духоўнага і эстэтычнага выхавання нашых грамадзян, прафесійную падрыхтоўку падрастаючага пакалення”, — адзначыў Прэм’ер-міністр.

“Мы ведаем, якія цяжкія задачы пастаўлены перад беларускім грамадствам Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2006 — 2010 гады. Вашы прафесійныя веды, высокая адказнасць і ўменне арганізаваць эфектыўную работу будуць садзейнічаць далейшаму паспяховаму сацыяльна-эканамічнаму і культурнаму развіццю нашай рэспублікі”, — падкрэсліў Сяргей Сідорскі, звяртаючыся да ўсіх узнагароджаных.

Спадчына — агульная

22 красавіка ў Мінску адбылося пасяджэнне Камісіі Парламенцкага сходу па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях. У ліку іншых было разгледжана пытанне аб нарматыўным вызначэнні парадку ўліку і захавання помнікаў, што адносяцца да агульнай гістарычнай спадчыны Саюзнай дзяржавы.

У ходзе пасяджэння саюзныя парламентарыі прааналізавалі падрыхтоўку пасяджэння семінара, які пастаянна дзейнічае пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі, на тэму “Развіццё турыстычнай індустрыі, сацыяльна-эканамічныя і культурна-пазнаваўчыя асновы”.

Старшыня Тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі Саюзнай дзяржавы Ігар Угольнікаў распавёў дэпутатам Парламенцкага сходу аб рэалізацыі кінапраекта “Брэсцкая крэпасць”.

Праект закону адобраны

23 красавіка Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь адобрыў праект Закону “Аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь “Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь”.

Законапраект утрымлівае норму, якая не дапускае рэкламы культурна-відовішчных мерапрыемстваў да атрымання пасведчання на права іх правядзення.

Гэтаксама забараняецца рэклама культурна-відовішчных мерапрыемстваў без указання спецыфікі іх правядзення: выкарыстоўваецца ці не выкарыстоўваецца фанаграма.

Не дапускаецца правядзенне культурна-відовішчных мерапрыемстваў з парушэннем аўтарскіх ці іншых сумежных правоў, а таксама з выкарыстаннем звестак, якія складаюць дзяржаўную ці іншую тайну, што ахоўваецца законам.

Як паведамляе “К” з нагоды прыняцця вышэйназванага законапраекта начальнік юрыдычнага аддзела Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Алена Вештарт, нормы гэтыя — не новыя, проста, раней яны былі прапісаны ў іншых заканадаўчых актах і Законам Рэспублікі Беларусь “Аб рэкламе”, слушна і своечасова прыведзены ў адпаведнасць з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13 мая 2008 года № 259 “Аб арганізацыі гастрольна-канцэртнай дзейнасці”.

Васемнаццаты дэвіз

18 мая ў свеце 31-ы раз адзначаць Міжнародны дзень музеяў. Як і штогод, свята атрымала сёлета свой дэвіз.



Па традыцыі, з 1992 года Кансультатыўны камітэт Міжнароднага савета музеяў зацвярджае дэвіз святкавання. Сёлета ім стала тэма “Музеі і турызм”.

Нагадаем, дэвізамі папярэдніх дзён музеяў, у прыватнасці, былі “Музеі як рухаючая сіла сацыяльных змен і прагрэсу” — летась, “Музеі і сусветная спадчына” — пазалетась, “Музеі і нематэрыяльная спадчына” — у 2004 годзе, “Барацьба з незаконным зваротам культурных каштоўнасцей” — у 1997 — 1998-м, “Музеі і карэнныя народы” — у 1993 годзе. Першым слоганам, у 1992-м, стаў “Музеі і навакольнае асяроддзе”.

Дэвізы дазваляюць вылучыць найбольш важкія пытанні галіны для ўсебаковага іх разгляду і прыцягнення ўвагі праз экспазіцыю, што зазвычай працуе ў гэты дзень бясплатна.

У бліжэйшых нумарах “К” праінфармуе чытачоў аб тых імпрэзах, што рыхтуюцца прэзентаваць айчынныя музеі на сваё свята, а таксама на папярэднюю яму “Ноч музеяў”.

Плакат і здаровы лад

Пачынаючы з красавіка і да 25 кастрычніка гэтага года Міністэрства культуры і Міністэрства аховы здароўя праводзяць Рэспубліканскі конкурс плаката “Небяспека — СНІД”.

Галоўнай мэтай конкурсу, які праводзіцца штогод для прафесійных мастакоў, студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтваў, навучэнцаў мастацкіх вучылішчаў, школ, каледжаў і гімназій, з’яўляецца адлюстраванне сродкамі плаката глабальнай небяспекі — СНІДу як цяжкага інфекцыйнага захворвання.

Наклееныя на цвёрдую аснову арыгіналы могуць быць выкананы ў тэхніках гуашы, темперы, фотамантажу і іншых.

За лепшыя плакаты пераможцы конкурсу заахвочваюцца прэміямі: дзве першыя — па 23 базавыя велічыні; тры другія — па 17; чатыры трэція — па 12.

Адзначым, што надрукаваныя плакаты будуць выкарыстоўвацца Рэспубліканскім цэнтрам гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя ў справе пашырэння барацьбы са СНІДам.

Ул. інф.

“Ад Масквы да Брэста…”

Мастацкі праект “Ад Масквы да Брэста…” падрыхтаваў да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Заслужаны калектыў “Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі”.

7 мая ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, ветэраны, змогуць наведаць гэтую праграму ў Вялікай зале Белдзяржфілармоніі, дзе запланавана цягам дня 3 канцэрты.

Праект “Ад Масквы да Брэста…” уключае ў сябе лепшыя франтавыя песні, якія спявалі знакамітыя выканаўцы: Леанід Уцёсаў, Клаўдзія Шульжэнка, Іосіф Кабзон, Людміла Гурчанка, Леў Лешчанка… У канцэрце прагучаць таксама і творы, якія помняць не многія, — напрыклад, музыка 40-х гадоў, што выконвалася ў аркестры Эдзі Рознера.

Наш кар.

Гісторыя з працягам

Маладыя беларускія музыканты перамаглі на Міжнародным конкурсе “Мастацтва XXI стагоддзя” ў Італіі.

Гран-пры атрымала салістка хору Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Алена Таболіч. Яе канцэртмайстар Святлана Колас-Іванова таксама была ўганаравана Гран-пры ў намінацыі “Мастацтва акампанементу”. А Першую прэмію заваявала Вольга Мілюта, якая заканчвае сёлета Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі па класе дацэнта Любові Каспорскай.

Італьянская вандроўка мела сваю беларуска-ўкраінскую перадгісторыю. Узімку тая ж Алена Таболіч, нядаўняя выпускніца нашай Акадэміі музыкі па класе прафесара Людмілы Колас, стала ўладальніцай Гран-пры на такім жа Міжнародным конкурсе “Мастацтва XXI стагоддзя”, толькі ў Кіеве. І заваявала права на сольны канцэрт у Італіі. Але на гэтым спявачка не супакоілася і паспрабавала свае сілы зноў — яшчэ і ў конкурсе.

Карысным для нашых удзельнікаў было ў Італіі не толькі творчае спаборніцтва, якое сёлета сабрала 83 вакалістаў у трох узроставых катэгорыях, але і шматлікія навукова-практычныя канферэнцыі, сімпозіумы, майстар-класы.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Сеткавая тэндэнцыя

Пад час працы ў беларускай сталіцы XVI Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі “TIBO-2009”, арганізаванай Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь, былі падведзены вынікі конкурсу на лепшы інтэрнет-рэсурс. Сярод пераможцаў — сайты ўстаноў культуры рэспублікі.

Спецыялізаваная выстаўка адбылася адначасова з Міжнародным форумам па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях “TIBO-2009”. У час выстаўкі падводзяцца вынікі прафесійнай “Інтэрнет-прэміі”, што прысуджаецца сеткавым работам, створаным у беларускім сектары Інтэрнета, за важкія сацыякультурныя, тэхналагічныя і мастацкія дасягненні ў галіне інфармацыі, культуры, мастацтва і адукацыі. Крытэрыямі ацэнкі журы з’яўляюцца змест, выкарыстанне тэхналогій і дызайн рэсурсу.

Сёлета для ўдзельнікаў прапаноўваліся 12 намінацый, а таксама ўручаліся спецыяльныя прызы журы.

У намінацыі “Культура і мастацтва” прыз атрымала работа супрацоўнікаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка — сайт www.museum.by. Рэсурс утрымлівае звесткі пра ўсе музейныя ўстановы нашай краіны, навіны і даведачную інфармацыю. Адзначым і пэўную тэндэнцыю, якую “К” ужо закранала сёлета (гл. № 12 за 2009 г.): толькі старонка Гомельскай вобласці мае завершаны выгляд і прадстаўляе поўны пералік названых устаноў рэгіёна, таму натуральная і пераемнасць у атрыманні спецыялізаванай прэміі. Летась яе “сольна” атрымаў якраз-такі музейны партал Гомельшчыны, а сёлета — праект агульнарэспубліканскі.

Лідэрам у намінацыі “Гандаль, каталогі, бібліятэкі, сеткавыя рэсурсы” стаў партал Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

У шэрагу намінацый пераможцы і лаўрэаты — інтэрнет-рэсурсы газет і тэлебачання, сеткавыя СМІ: Беларускае тэлеграфнае агенцтва, сайт Тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі Саюзнай дзяржавы, буда-кашалёўская раённая газета “Авангард”, Агульнанацыянальнае тэлебачанне. Сярод работ для дзяцей і юнацтва вылучаны сайт выдавецтва “Пачатковая школа”. Спецыяльным прызам журы было адзначана Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь за актыўную працу па развіцці беларускага сектара Інтэрнета.

І ружа, і “Руджа”…

Персідскія ўзоры на слуцкіх паясах даўно знаёмы беларусам. Не менш прыгожа выглядаюць і персідскія дываны, што вырабляюцца ў Іране цягам доўгіх стагоддзяў. Пазнаёміцца з імі змаглі і госці Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, дзе адкрылася выстаўка “З гісторыі мастацтва Ірана”, арганізаваная сумесна з Пасольствам Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь.

На выстаўцы прадстаўлены мастацкія дываны ручной работы, некаторыя з якіх вышыты скурай. Сярод іх — і унікальны дыван, чый узрост складае каля 250 гадоў.

Як адзначыў на цырымоніі адкрыцця выстаўкі намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Віктар Кураш, з 1995 года, калі быў падпісаны мемарандум аб культурным супрацоўніцтве, узаемасувязі паміж нашай краінай і Іранам пашыраюцца, набываюць дынамічны, паслядоўны характар і, галоўнае, узбагачаюць народы нацыянальнымі традыцыямі. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь Сейед Абдала Хасейні, у сваю чаргу, падкрэсліў, што палітычныя адносіны паміж нашымі краінамі могуць быць устойлівымі, знаходзячыся ў правільным культурным рэчышчы.

Акрамя дываноў, на выстаўцы экспануюцца і прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, выкананыя ў тэхніцы інкрустацыі, эмалі, чаканкі, мазаікі, а таксама іранская мініяцюра і творы жывапісу Махмуда Фаршчыяна, у чыіх работах выразна прасочваюцца нацыянальныя традыцыі персідскай мініяцюры, усходні містыцызм.

Варта адзначыць, што ўрачыстая цырымонія адкрыцця выстаўкі суправаджалася музыкай у выкананні калектыву “Руджа”, у складзе якога — іранскія студэнты айчынных ВНУ.

Кастусь АНТАНОВІЧ

На здымках: Віктар Кураш і Сейед Абдала Хасейні; выступае “Руджа”.

Фота аўтара

Ад кірыліцы — да ноў-хаў

Чарговым крокам у двухбаковым культурным супрацоўніцтве Беларусі і Балгарыі стала перадача кніг ад Пасольства Рэспублікі Балгарыя ў нашай краіне ў дар Нацыянальнай бібліятэцы. Гэта працяг плённай узаемасувязі паміж вядучымі бібліятэкамі дзвюх дзяржаў.

Пад час урачыстай цырымоніі па рашэнні Савета дырэктараў асацыяцыі “Балгарская кніга” і асабістай ініцыятыве Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Балгарыя ў нашай краіне Петкі Ганчава Нацыянальнай бібліятэцы былі перададзены кнігі, што ў лютым гэтага года былі прадстаўлены на XVI Міжнароднай Мінскай выстаўцы-кірмашы “Кнігі Беларусі”.

Па словах Петкі Ганчава, яму выпаў гонар падарыць кнігі сапраўднаму цэнтру духоўнасці Беларусі, што здзівіў, найперш, сваёй вытанчанасцю, функцыянальнасцю і унікальнымі фаліянтамі. Пасол падкрэсліў, што яму прыемна дадаць да гэтых багацтваў і частку балгарскай духоўнасці. Дзякуючы такому кроку, у чытачоў Нацыянальнай бібліятэкі з’явілася магчымасць пазнаёміцца з сучаснай Балгарыяй, яе традыцыямі і найноўшымі навуковымі распрацоўкамі. Прадстаўлены кнігі самых выбітных пісьменнікаў, у прыватнасці, Антона Дончава, шмат спецыяльнай літаратуры, прысвечанай асобным відам мастацтва. Усяго ж балгарскі падарунак уключае больш за сто кніг.

У сваю чаргу, дырэктар НББ Раман Матульскі адзначыў, што нашы народы маюць старажытныя культурныя ўзаемасувязі, пачынаючы з дзейнасці святых асветнікаў Кірылы і Мяфодзія. Прыемна таксама бачыць, што сёння супрацоўніцтва не абмяжоўваецца толькі кнігаабменам. Па словах дырэктара бібліятэкі, адбываюцца сумесныя навуковыя даследаванні. У прыватнасці, у Балгарыі апошнім часам выйшлі публікацыі па гісторыі бібліятэчнай і кніжнай справы ў Беларусі.

К.А.

Духоўная місія бібліятэк

21 — 22 мая ў сталіцы пройдуць XV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры.

Сярод арганізатараў Чытанняў — міністэрствы культуры і адукацыі Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Беларускі экзархат Рускай Праваслаўнай Царквы і іншыя арганізацыі.

Па блаславленні Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі ў рамках XV Міжнародных Кірыла-Мяфодзеўскіх чытанняў адбудзецца штогадовая канферэнцыя “Духоўнае адраджэнне грамадства і праваслаўная кніга”. Яе цэнтральнай тэмай стане духоўна-асветніцкая місія бібліятэк. Сярод тэм выступленняў заяўлены ўзаемадзеянне публічных і царкоўных бібліятэк па духоўна-маральным выхаванні на праваслаўных традыцыях, духоўнасць і праблемы дзіцячага чытання, праваслаўныя традыцыі і нацыянальная культура, выяўленчае мастацтва і музыка ў духоўна-маральным выхаванні чытачоў.

Свае даклады прапануюць прадстаўнікі царкоўных і свецкіх бібліятэк усіх сістэм і ведамстваў, работнікі адукацыі і культуры. Яны падзеляцца вопытам, у тым ліку, і па фарміраванні фондаў адпаведнай літаратурай, а таксама па наладжванні аўтаматызаваных пошукавых сістэм.

Афіцыйна

Міністэрствам культуры, падпарадкаванымі арганізацыямі ў 2008 годзе і 1 квартале 2009 года праведзена пэўная работа па выкананні Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2006 г. № 2 "Аб мерах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарата" (далей — Дырэктыва № 2).

Паўсюдна ўсімі кіраўнікамі ўстаноў культуры і мастацтва рэспубліканскага падпарадкавання арганізаваны асабісты прыём грамадзян і ўлік вусных зваротаў. У Міністэрства культуры штоквартальна прадастаўляецца адпаведная ведамасная справаздачнасць. Інфармацыя аб парадку асабістага прыёму грамадзян кіраўнікамі арганізацый размешчана на інфармацыйных стэндах устаноў культуры і мастацтва, аб асабістым прыёме грамадзян кіраўнікамі Міністэрства — на стэндах і афіцыйным сайце Міністэрства. У апараце Міністэрства і ў 47 падпарадкаваных арганізацый прадугледжаны папярэдні запіс грамадзян на асабісты прыём, што ліквідуе прычыны ўтварэння чэргаў і працяглага чакання прыёму.

Дынаміка зніжэння паказчыкаў па асабістым прыёме грамадзян, запісах у кнігах заўваг і прапаноў дазволіць зрабіць выснову аб паляпшэнні, у цэлым, якасці працы з грамадзянамі з боку кіраўнікоў арганізацый культуры і мастацтва.

Разам з тым, аналіз правядзення асабістага прыёму грамадзян ва ўстановах рэспубліканскага падпарадкавання паказаў, што ў большасці з іх патрабаванні Дырэктывы № 2 у частцы арганізацыі прыёму ў зручны для насельніцтва час выконваюцца не ў поўнай меры. Па-ранейшаму кіраўнікі схіляюцца да прыёму грамадзян у працоўны час. У некаторых службовых асоб звесткі аб графіку прыёму грамадзян адсутнічаюць на дзвярах іх кабінетаў.

Міністэрства культуры ажыццяўляе дзве адміністрацыйныя працэдуры па заяўках грамадзян: выдачу пасведчанняў на права вывазу (перасылкі) культурных каштоўнасцей з тэрыторыі рэспублікі і выдачу дазволаў на выкананне работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях. За справаздачны перыяд прэтэнзій, заўваг ад грамадзян па парадку і тэрмінах ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур не паступала.

Праведзеная работа па інфарматызацыі ўпраўлення галіной і аптымізацыі справаздачна-статыстычнай дзейнасці дазволіла Міністэрству культуры ўнесці ў Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь прапановы аб скарачэнні чатырох форм цэнтралізаваных дзяржаўных статыстычных назіранняў, чатырох форм ведамаснай справаздачнасці па пытаннях дзейнасці сферы культуры, а таксама павялічыць перыяды прадстаўлення інфармацыі па дзвюх формах ведамаснай справаздачнасці. Рэалізацыя гэтых прапаноў значна знізіць нагрузку на рэспандэнтаў ужо ў бягучым годзе.

Разам з тым, перадача Міністэрству культуры функцый збору і абагульнення інфармацыі аб дзейнасці ўстаноў галіны з наступнай яе перадачай Белстату для ўключэння ў дзяржаўную статыстычную справаздачнасць прад'яўляе выключна высокія патрабаванні да якасці вядзення інтэграваных банкаў даных.

Па выніках 1 квартала 2009 года з сямі абласных і Мінскага гарадскога банкаў даных у галіновы банк без заўваг прынята інфармацыя толькі па Гродзенскай і Мінскай абласцях. Не ў поўным аб'ёме ўведзена інфармацыя ў банкі даных устаноў культуры і мастацтва Брэсцкай, Гомельскай абласцей і г. Мінска. Няякасна абноўлена база даных Магілёўскай вобласці. Не прадстаўлена абноўленая база даных Віцебскай вобласці.

Калегія Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

РАШЭННЕ КАЛЕГІІ 22.04.2009 г. г. Мінск № 53 Аб рабоце па выкананні патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2006 г. № 2 "Аб мерах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарата" ў 2008 годзе і 1 квартале 2009 года

ВЫРАШЫЛА:

1. Указаць начальнікам упраўленняў культуры Віцебскага, Магілёўскага аблвыканкамаў Пашынскаму М.П. і Сінкаўцу А.А. на нізкі ўзровень арганізацыйных работ і адсутнасць кантролю за вядзеннем абласных банкаў даных.

2. Начальнікам упраўлення культуры аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама:

2.1. разгледзець у маі 2009 г. на пашыраных пасяджэннях калегій упраўленняў культуры і пасяджэннях Саветаў аддзелаў культуры гар-, райвыканкамаў пытанне аб стане і першачарговых мерах па павышэнні якасці вядзення абласных, гарадскіх, раённых банкаў даных, іх практычным выкарыстанні, выпрацаваць дзейсную сістэму кантролю якасці вядзення банкаў даных;

2.2. да 15 мая 2009 г. забяспечыць накіраванне ў падпарадкаваныя ўпраўленням і аддзелам культуры арганізацыі праграмна-інфармацыйных комплексаў "Установа — версія 09" з функцыяй абмежавання ўводу даных з памылкамі (далей — ПІК-У-09);

2.3. арганізаваць, пачынаючы з чэрвеня 2009 г., дакументаванне на папяровых носьбітах абнаўленняў інфармацыі ў ПІК-У-09, забяспечыць іх захаванне ў справаводстве падпарадкаваных упраўленням і аддзелам культуры арганізацый;

2.4. прыняць меры па кадравым умацаванні абласных і раённых метадычных цэнтраў народнай творчасці, раённых метадычных цэнтраў, іншых арганізацый, якія ажыццяўляюць вядзенне адпаведных банкаў даных, спецыялістамі ў сферы інфармацыйных тэхналогій за кошт перараздмеркавання функцый паміж работнікамі ўказаных арганізацый;

2.5. да 10 ліпеня 2009 г. забяспечыць якаснае абнаўленне абласных, гарадскіх, раённых банкаў даных з адлюстраваннем у іх інфармацыі аб дзейнасці музеяў і дзіцячых школ мастацтваў.

3. Кіраўнікам падпарадкаваных Міністэрству культуры арганізацый:

3.1. да 1 мая 2009 г. прывесці рэжым асабістага прыёму грамадзян у адпаведнасць з патрабаваннямі падпункта 1.3. Дырэктывы № 2 і прадставіць справаздачу аб выкананні дадзенага даручэння;

3.2. да 5 мая 2009 г. забяспечыць прадстаўленне ва ўстаноўленым парадку ва ўстанову адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" абноўленай інфармацыі ў ПІК-У-09. Забяспечыць штомесячнае дакументаванне на папяровых носьбітах вышэйуказанага і ўсіх наступных абнаўленняў інфармацыі, іх захаванне ў справаводстве арганізацыі.

4. Установе адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" (Святлоў Б.У.) сумесна з абласнымі метадычнымі цэнтрамі народнай творчасці да 1 чэрвеня 2009 г. распрацаваць і прадставіць на зацвярджэнне сістэму паказчыкаў дзейнасці клубных устаноў, бібліятэк, музеяў, паркаў культуры і адпачынку.

5. Упраўленням устаноў культуры і народнай творчасці (Чэрнік В.М.), навучальных устаноў і кадраў (Шмакава Н.Ю.), капітальнага будаўніцтва і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння (Рымашэўскі В.В.) сумесна з установай адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" (Святлоў Б.У.) да 20 ліпеня і 20 кастрычніка 2009 г., 20 студзеня 2010 г. правесці аналіз якасці абнаўлення галіновага інтэграванага банка даных па курыруемых накірунках дзейнасці і аформіць вынікі аналізу адпаведнымі прыёмнымі актамі.

6. Аддзелу кантролю і справаводства (Груздоў А.В.), установе адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" (Святлоў Б.У.), кантрольна-рэвізійнаму аддзелу (Кізім А.С.), юрыдычнаму аддзелу (Вештарт А.П.) сумесна з Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі да 1 лістапада 2009 г. распрацаваць Палажэнне аб галіновым інтэграваным банку даных устаноў культуры і мастацтва Рэспублікі Беларусь.

7. Кантроль за выкананнем дадзенага рашэння ўскласці на намесніка міністра Кураша В.І.

Старшыня калегіі, міністр культуры У.Ф. МАТВЕЙЧУК

Удакладненне

У мінулым нумары "Культуры" ў артыкуле "Музыка, грошы і кніга заўваг" першы сказ трэба чытаць: "22 красавіка адбылася чарговая калегія Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь". Прыносім свае прабачэнні за памылку.

Водгук кампетэнтнага чытача

Навуковая канцэпцыя Нацыянальнага гістарычнага музея, скарочаны варыянт якой быў змешчаны ў "К", ужо зацверджана. І тым не менш, кожны знаўца ці аматар айчыннай даўніны можа яшчэ выказацца: прапанаваць свае дапаўненні, падзяліцца ідэямі адносна будучай экспазіцыі. Як адзначыла намеснік дырэктара па навуковай рабоце Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі Ніна Калымага, апошнім часам даволі шмат наведвальнікаў звяртаюцца да адміністрацыі ўстановы са сваімі думкамі наконт будучай экспазіцыі. Па завярэнні кіраўніцтва музея, пасля грамадскага абмеркавання ўсе прапановы будуць улічаны і, па-магчымасці, дабаўлены ў план рэалізацыі Канцэпцыі, што распачнецца напрыканцы гэтага года.

Сёння мы распачынаем змяшчаць водгукі нашых чытачоў, сярод якіх — доктар гістарычных навук, прафесар Сяргей Рассадзін.

Абмяркоўваючы Канцэпцыю

"Адчыненыя дзверы" — функцыянальна!

…Дзіўна, але я даволі добра памятаю, як я, ці не сямігадовым яшчэ хлапчуком, упершыню ў жыцці наведаў гэты музей. Здаецца, што я зноў адчуваю нават той унікальны музейны пах. Як жа мяне тады ўразіла веліч мармуровых бюстаў і фельдмаршальскіх эпалетаў, урачыстасць парадных партрэтаў вяльможных паноў і пані, смяротная пагроза, што таілася ў лязах алебардаў, шпаг і шабляў, хай сабе і схаваных за вітрыннае шкло!.. Стаўшы прафесійным археолагам, я часам нават "падмірґваў" сваім уласным знаходкам, што трапілі ў шыкоўную музейную экспазіцыю.

Зараз я гляджу на ўсё гэта ўжо зусім іншым, заклапочаным, вокам. Маю турботу: як лепш замузеефікаваць унікальны археалагічны помнік V — XVIII стст. — Шаціпінскі Востраў, раскопкі якога ў хуткім часе ўжо скончу? Безумоўная папярэдніца сучаснага Светлагорска, аднайменная сядзіба павінна, пасля яе аднаўлення, адыгрываць ролю гістарычнага цэнтра гэтага заўсёды маладога горада. І скажу шчыра: адказы, ва ўсялякім разе — на некаторыя пытанні, я знайшоў у рэцэнзуемай Канцэпцыі.

Адразу бачны высокі навукова-прафесійны статус гэтага дакумента. Зразумела, што гэта вынік супольнай працы і лепшых "музейшчыкаў", і лепшых гісторыкаў Беларусі: усё — грунтоўна, аргументавана, дасканала, пачынаючы ўжо з "Уводзін". У прыватнасці, цяжка не пагадзіцца з думкай, што стварэнне нацыянальных музеяў — яскравая прыкмета сталасці самой нацыі. Вельмі дарэчы ў тэксце Канцэпцыі прыводзіцца цытата з Давіда. Вялікі французскі мастак у час Вялікай рэвалюцыі ў Парыжы сказаў, аказваецца, наступнае: "Музей — зусім не дарэмны збор прадметаў раскошы і марнасці, якія служаць толькі для задавальнення цікаўнасці. Музей, правільна арганізаваны, можа і павінен стаць школай вялікага значэння, школай выхавання". Стваральнікамі Канцэпцыі гэта спецыяльна не падкрэслівалася, але яны, увогуле, зыходзілі з таго, што самі вытокі ідэі беларускага нацыянальнага музея ўзыходзяць, практычна, ці не да часоў Давідавых. У пэўным сэнсе іх саўтарамі можна назваць саміх славутых нашых вучоных графоў, у тым ліку — настойваю на гэтым! — таксама і Міхала Тышкевіча. Збіраючы матэрыял для сваёй чарговай манаграфіі, я сутыкнуўся з цікавым фактам: граф Міхал, уладальнік маёнтка ў Барысаўскім павеце, вярнуўшыся з раскопак у Егіпце, павёз свае знаходкі на экспертызу проста ў Парыж. А там эксперты з Луўра пачалі спрачацца наконт іх кошту. Граф наш слухаў, слухаў, а потым зрабіў шырокі жэст сапраўднага магната: маўляў, не трэба ніводнага су — я ўсё гэта вам дару, месье! Засмучае толькі, як шмат нашага, беларускага, разышлося па чужых музеях. І тым мацней, здаецца, імкненне аўтараў Канцэпцыі кампенсаваць, па магчымасці, гэткія страты.

Як я зразумеў, гэта плануецца здзейсніць, узняўшы да актыўнага функцыянавання тыя перліны і дыяменты, якімі вельмі багатая наша зямля і якія, у сваёй большасці, яшчэ схаваны ў невядомасці. Як жа зняць яе "ўпакоўку" з нашых гістарычных скарбаў? Прапанавана мноства канкрэтных захадаў, з якіх мне найбольш падабаецца ідэя адкрытага захавання фондаў. Увогуле, слушна, што нашы спецыялісты гэтак творча ставяцца да вельмі папулярнай на Захадзе ідэі функцыянальнага музея. Падкажу: вельмі ўдала сваё практычнае выкарыстанне гэты падыход знайшоў у Музеі вікінгаў у нямецкім Шлезвігу, а таксама ў Нацыянальным музеі археалогіі ў Сен-Жэрмен-дэ-Анле пад Парыжам.

Наўмысна пакіну мілую майму сэрцу старажытнасць, каб адзначыць прафесійную смеласць нашых музейшчыкаў. Яны ж не пабаяліся хіба не гэткую, як і нашай слаўнай мінуўшчыне, увагу адрасаваць таксама і сучаснасці. Цалкам згодны: суверэнная Беларусь таго вартая! Хацеў бы хутчэй наведаць залу, прысвечаную менавіта нашым спартыўным перамогам!

Канешне, рэцэнзіі без заўваг не бывае. Праект прыгожы, але наколькі ён рэальны фінансава? Прабачце, што заканчэнне ў мяне атрымліваецца менш узнёслае, чым пачатак. Проста, жыццё зараз такое… Аднак крызісы, дзякуй Богу, сыходзяць, а Музей — застаецца назаўсёды. У добры час!

Сяргей РАССАДЗІН, доктар гістарычных навук, прафесар

Рэакцыя на публікацыю

Бібліобус: не шкадавалі ні разу!

Добры дзень, паважаная рэдакцыя газеты "Культура"!

З цікавасцю прачытала ў № 15 газеты "Культура" артыкул "Як бібліобусу не трапіць у "Чырвоную кнігу" Гомельшчыны?". У мяне ёсць свой погляд на гэты конт.

Столінскі раён першым у Брэсцкай вобласці арганізаваў работу бібліобуса, які працуе, дарэчы, з 2007 года. Напачатку адчуваліся некаторыя цяжкасці, але пашкадаваць аб увядзенні новай формы абслугоўвання не давялося ні разу. Абслугоўваем 17 вёсак, дзе няма стацыянарных устаноў культуры, людзей сталага узросту і тых, у каго абмежаваныя фізічныя магчымасці.

Інтэлектуальныя запатрабаванні жыхароў задавальняюць 64 бібліятэкі, а населеных пунктаў у раёне значна больш. Вось тут вельмі дарэчы прыйшоўся бібліобус. Прыгожа афармлены звонку — з назвамі "Бібліобус" спераду і "Перасовачная бібліятэка" на бартах, маляўнічымі рэкламнымі матэрыяламі, светлы і даволі ўтульны ўнутры, "нашпігаваны" тэхнікай, друкаванай прадукцыяй, новенькі ПАЗ з'явіўся на дарогах раёна. І адразу ж выклікаў цікавасць у вяскоўцаў. Некаторыя — з недаверам, іншыя — са здзіўленнем прыглядаліся да новай установы. Але ў хуткім часе і тыя, і другія сталі прыхільнікамі бібліятэкі.

Нашы карыстальнікі — прадстаўнікі розных узроставых катэгорый: дзеці, моладзь, людзі сталага ўзросту. Да іх паслуг — цікавыя кнігі і часопісы, Публічны цэнтр прававой інфармацыі, Банк сацыяльнай інфармацыі (папкі з інфармацыяй пра работу прадпрыемстваў і арганізацый раённага цэнтра), камп'ютэр, шматфункцыянальнае ўстройства, відэадвойка. Кожны прыезд у населены пункт — своеасаблівае свята: вёска ажыўляецца, каля бібліобуса стаіць гамана, ідзе актыўны абмен думкамі, даюцца слушныя парады. У некаторых вёсках даводзіцца абслугоўваць звыш 30 наведвальнікаў запар. Бібліятэкар бібліобуса Савончык Таццяна Аляксандраўна кажа, што ў такія моманты адчуваеш значнасць сваёй прафесіі, пераконваешся: вяскоўцы прагнуць чытаць, імкнуцца да крыніц інфармацыі. Для сельскіх жыхароў праводзяцца інфармацыйныя хвілінкі, гутаркі, прагляды на тэмы: "2009-ты — Год роднай зямлі"," Пра здароўе і не толькі", "Цікавае ў часопісах", "Увага! Новыя кнігі!" і інш. У маі — чэрвені плануецца правесці цыкл мерапрыемстваў пад назвай "Я з натхненнем Пушкіна чытаю…". Жыхары Бор-Дубянца, Малых Арлоў, Кашары і іншых вёсак з нецярпеннем чакаюць прыезду бібліобуса. У Кнізе водгукаў — толькі станоўчыя адзнакі, якімі ацэнена работа перасовачнай бібліятэкі.

Паслугі бібліобуса выкарыстоўваюцца для дастаўкі кніг у бібліятэкі, пры правядзенні раённых мерапрыемстваў (свят, выязных сесій, семінараў). У перыяд правядзення сельскагаспадарчых кампаній перасовачную бібліятэку цёпла прымаюць на палях, збожжатоках, фермах.

Бібліобус у раёне запатрабаваны, на сённяшні дзень ён — неабходнасць, дзякуючы якой мы маем магчымасць адпавядаць сучасным патрабаванням да бібліятэчнай работы.

Людміла НЕЎДАХ, дырэктар Столінскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы

Незапатрабаваны... “прасунутыя” спецыялісты

Размеркаванне як “рынак працы”, або Камісія слязам не верыць

Зрэшты, чалавечы фактар таксама ўлічваўся. І таму для абедзвюх сёстраў-блізнят Аўчыннік знайшліся месцы ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы.

— Агульная тэндэнцыя сёлетняга размеркавання ніякіх істотных змен не зведала, — пракаменціравала ход кампаніі начальнік упраўлення навучальных устаноў і кадраў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Наталля Шмакава. — Як і ў апошнія тры гады, бадай усе выпускнікі Універсітэта культуры і мастацтваў, якія не маюць прадугледжаных заканадаўствам ільготаў, адправяцца працаваць за межы сталіцы, ліквідуючы тым самым кадравы дэфіцыт у рэгіёнах. Аднак сёлетняе размеркаванне засведчыла, што студэнты ўжо ўспрымаюць такі паварот падзей як належнае і псіхалагічна да яго гатовы. Вядома, не ўсе — некаторыя шукаюць магчымасці праўдамі і няпраўдамі застацца ў Мінску і вельмі засмучаны, калі гэта не ўдаецца. Але бачылі б вы, колькі слёз было яшчэ тры гады таму!

Кадравы аўкцыён

Размеркаванне — гэта акурат тое мерапрыемства, дзе абстрактны выраз “рынак працы” набывае сваё канкрэтнае ўвасабленне. А калі ўлічыць, што колькасць заявак значна перавышае колькасць выпускнікоў — і, адпаведна, у кожнага з іх ёсць выбар, — рынак часам ператвараецца ў своеасаблівы аўкцыён.

— А чаму б вам не паехаць у Брэст? — намаўляе выпускніцу “эмісар” тамтэйшага ўпраўлення культуры. — У абласной бібліятэцы для вас акурат знойдзецца месца. Інтэрнат забяспечым.

— У Віцебск не хочаце? — перахоплівае ініцыятыву прадстаўнік “паўночнай сталіцы”. — У нас жыццё цікавае — згадайце хаця б “Славянскі базар”!

— А можа, лепей у Бабруйск? Гэта вам і ад бацькоўскага дома куды бліжэй — усяго якіх пяцьдзесят кіламетраў, — уступае ў “таргі” калега з Магілёўшчыны, — ды і горад цяпер такі прыгожы стаў...

Выпускніца на хвіліну змаўкае: відаць, што яна вагаецца і раздумвае.

Райцэнтры і аграгарадкі выпускнікі выбіралі пераважна ў тым выпадку, калі мелі жаданне вярнуцца на сваю малую радзіму. Іншыя ж імкнуліся ў вялікія гарады, — балазе вакансій у абласных музеях і бібліятэках нямала.

І такая сітуацыя цалкам вытлумачальная. У тым ліку і таму, што ў гамане “купцоў” галасоў начальнікаў райаддзелаў культуры і дырэктараў ЦБС “з глыбінкі” ў той дзень нешта было не чуваць. Гэта намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Людміла Кірухіна знайшла час, каб асабіста ўзяць самы чынны ўдзел у размеркаванні, — як і многія яе мінскія калегі. А вось наплыву кіраўнікоў з рэгіёнаў не назіралася. Хаця магчымасць вярнуцца дахаты не “з пустымі рукамі” была ў іх зусім не прывіднай. Таму і наракаць у дадзеным выпадку няма на што: рынак ёсць рынак.

Размеркаванне выпускнікоў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў адбывалася ў спакойным рытме. Але ж усплёскі нервознасці ўсё ж здараліся. Асобныя студэнты не хавалі свайго незадавальнення і прынцыпова адмаўляліся падпісаць ведамасць, а хтосьці нават не стрымліваў слёз. Але камісія не надта звяртала на іх увагу — яна кіравалася зусім не эмоцыямі, а заканадаўствам і прагматыкай культурнай палітыкі краіны.

Адна з выпускніц адразу дала зразумець: па вялікім рахунку, ёй усё адно, у якой вобласці або раёне працаваць, галоўнае — каб там былі прымальныя жыллёвыя ўмовы. І цалкам верагодна, што гэтая дзяўчына ахвотна прамяняла б месца ў гомельскім інтэрнаце на кватэру або хаця б добры пакой у мястэчку (тым болей, з жытлом там зазвычай прасцей, чым у буйных гарадах). Вядома, калі такі варыянт ёй быў бы прапанаваны.

— Мы не настойваем на тым, каб выпускнікі ВНУ выпраўляліся працаваць у вёску: праблему з кадрамі там прызначаны вырашаць перш-наперш сярэднеспецыяльныя адукацыйныя ўстановы, — адзначыла Наталля Шмакава. — Але калі хтосьці выказвае такое жаданне добраахвотна, гэта толькі вітаецца.

Увогуле, па словах Наталлі Шмакавай, патрабаванні выпускніка пры выбары месца працы могуць быць самыя розныя. Кагосьці цікавіць памер заробку, кагосьці — жыллёвыя ўмовы, а кагосьці — перш-наперш магчымасць кар’ернага росту. Моладзь не баіцца адказнасці і таму ахвотна пагаджаецца на дырэктарскія пасады. Дарэчы, менавіта апошні фактар і змушае некаторых маладых спецыялістаў выпраўляцца ў сельскую мясцовасць. Яны разумеюць, што лепей быць “першым хлопцам” у аграгарадку, чым апошнім — у горадзе.

— Дарэчы, і чыста побытавыя ўмовы ў аграгарадку куды прасцей вырашыць, чым у вялікім горадзе, — дадае Наталля Шмакава. — Ці часта бывае так, што маладому спецыялісту ў Мінску праз два гады ўжо даюць двухпакаёўку?

— Чаму ж толькі праз два гады? — уступае ў размову першы прарэктар БДУКіМ Юрый Бондар. — Учора, калі мы размяркоўвалі клубнікаў, катэдж на Клічаўшчыне адразу прапаноўвалі.

Дарэчы, кінулася ў вочы і яшчэ адна тэндэнцыя: былі выпускнікі, якія аддавалі перавагу вёскам перад абласнымі цэнтрамі відавочна па той прычыне, што яны знаходзяцца ў Мінскай вобласці. Сапраўды: стэрэатыпы — рэч жывучая...

Юрыдычныя нюансы

...Чарговай да стала камісіі падыйшла прывабная высокая брунетка. Яна папрасіла размеркаваць яе ў Мінск: па месцы працы будучага мужа. На асцярожную заўвагу кагосьці з членаў камісіі наконт таго, што пра *будучых* сужэнцаў у Палажэнні аб размеркаванні нічога не гаворыцца, дзяўчына адказала: “Дык у нас заўтра вяселле!”

Пачуліся прапановы зрабіць ёй своеасаблівы падарунак, каб не псаваць настрой у такі ўрачысты дзень. Але... Артыкул пра “авансы” і “падарункі” ў Палажэнні таксама адсутнічае. Зрэшты, часу да 1 жніўня нявесце будзе цалкам дастаткова, каб перараз мяркавацца згодна са зменай жыццёвых абставін.

Здарыўся і яшчэ адзін спрэчны выпадак такога кшталту. Маладая сям’я стала жыве ў Мінску, але муж выпускніцы прапісаны ў Барысаве. Студэнтка нагадала, што, паводле заканадаўства, яна можа быць размеркавана не толькі па месцы прапіскі, але і па месцы працы мужа.

— Але вы забыліся пра адно ўдакладненне ў згаданым вамі артыкуле: *пры наяўнасці магчымасці*, — парыраваў Юрый Бондар. І дзяўчыну размеркавалі ў Мінскую вобласць.

Увогуле, як адзначыў першы прарэктар, сёлета выпускнікі валодаюць заканадаўствам вельмі прыстойна. Гэтаму спрыялі адмысловыя пасяджэнні факультэцкіх камісій, дзе ўважліва разглядаліся ўсе пункты Палажэння аб парадку размеркавання.

— Таму, як вы маглі сёння заўважыць, пытанняў на гэты конт узнікала вельмі мала, — дадаў карэспандэнту “К” Юрый Бондар. — Дзякуючы праведзенай універсітэтам рабоце, выпускнікі добра ведаюць свае правы і абавязкі і разумеюць, на што яны могуць разлічваць. Вядома, здараліся і выпадкі, калі заканадаўства даводзілася тлумачыць непасрэдна на размеркаванні, але гэта, хутчэй, выключэнні.

І сапраўды: некаторыя выпускнікі цытавалі Палажэнне па памяці — прынамсі, тыя яго пункты, якія тычыліся непасрэдна іх сітуацыі.

Каму “вольнае плаванне”?

Сапраўдным выключэннем з правілаў стала размеркаванне тых выпускнікоў універсітэта, якія атрымалі спецыяльнасць “лінгвістычнае забеспячэнне міжнародных камунікацый”. Бібліятэкараў “адрывалі з рукамі”, а вось гэтыя “прасунутыя” спецыялісты, якія прафесійна валодаюць двума замежнымі мовамі, аказаліся абсалютна незапатрабаванымі: установы культуры не даслалі на іх ніводнай заяўкі! Таму выпускнікоў размяркоўвалі куды заўгодна: на прамысловыя прадпрыемствы і нават прыватныя фірмы. А большасць увогуле не атрымала ніводнай прапановы аб працаўладкаванні.

— Мы адправілі болей за сотню лістоў у розныя ўстановы, якія маглі б быць зацікаўленымі ў такіх спецыялістах, але ж водгукаў было вельмі мала, — распавёў дэкан факультэта інфрамацыйна-дакументных камунікацый Мікалай Яцэвіч. — Быў і такі выпадак: адна фірма спярша даслала заяўку, а потым яе адклікала: маўляў, у цяперашні час даводзіцца скарачаць штат — не тое што браць на працу новых супрацоўнікаў...

Таму, на вялікі жаль, сёлетнія выпускнікі гэтай спецыяльнасці сталі апошнімі: набор на яе не праводзіўся вось ужо чатыры гады.

Бадай усе яны скарысталіся сваім законнным правам і выбралі “вольны дыплом”. Так, менавіта выбралі! Бо члены камісіі прапанавалі ім заняць любую са шматлікіх вакансій па іншай спецыяльнасці — бібліятэчнай, спадзеючыся, што яе асваенне для прафесійных рэферэнтаў не будзе складаным. Ды і Людміла Кірухіна настойліва запрашала іх да сябе ў штат, прываблiваючы магчымасцямі творчага самавыяўлення і далейшага ўдасканалення сваіх ведаў — у тым ліку і праз замежныя стажыроўкі. Яно і зразумела: спецыялісты з веданнем моў у “нацыяналцы” без справы яўна не застануцца.

Ды толькі — марна! Нягледзячы на ўсе ўгаворы, дзяўчаты-выпускніцы адна за адной абіралі “вольнае плаванне”, пагрэбаваўшы тымі гарантыямі, якія дае статус маладога спецыяліста.

— У прыватнай структуры ў іх такіх гарантый не будзе, — адзначыла Наталля Шмакава. — Там усё часта можа залежыць ад настрою кіраўніка. І таму, можа, камусьці давядзецца і пашкадаваць пра тое, што ён выбраў вольны дыплом.

* * *

Паслядоўная кадравая палітыка, якая праводзіцца на дзяржаўным узроўні, неаспрэчна, дае свае вынікі. Але дасягнуць таго, каб выпускнікі выпраўляліся працаваць у рэгіёны — гэта толькі палова справы. Пра поўны яе поспех можна казаць адно ў тым выпадку, калі яны “пускаюць там карані”, а не збягаюць у сталіцу па сканчэнні адведзеных заканадаўствам двух гадоў.

З моманту кардынальнай змены падыходу да размеркавання выпускнікоў ВНУ культуры і мастацтваў прайшло ўжо тры гады. Значыць, можна зрабіць першыя высновы і аб замацаванні маладых спецыялістаў.

— Большасць з іх не пакінула свае працоўныя месцы і па сканчэнні размеркавання, — адзначыла з гэтай нагоды Наталля Шмакава. — І, як кажуць начальнікі абласных упраўленняў, працуюць гэтыя спецыялісты ахвотна. Болей за тое: ведаю не адзін прыклад, калі пазіцыя выпускнікоў, якія нізавошта не хацелі пакідаць сталіцу, потым істотна змянілася. Яно і зразумела: знайсці працу ў Мінску не так і лёгка. Скажам, клубнікі ў сталіцы, наколькі я ведаю, увогуле не надта запатрабаваны. Ды нават калі хто і застаецца, ён губляецца ў вялікім горадзе. А на радзіме работнік культуры адчувае сябе патрэбным людзям.

І цалкам магчыма, што тыя, хто яшчэ ўчора ліў слёзы з-за неабходнасці пакінуць сталіцу, ужо вельмі хутка будзе радавацца з гэтай прычыны: калі перад імі адкрыюцца новыя творчыя далягляды і жыццёвыя перспектывы.

Ілля СВІРЫН

Дзякуючы яму "Беларусьфільм" стаў "радзімай" Бураціна, Зорнага хлопчыка, Пітэра Пэна, які вучыў: "А ты падумай пра што-небудзь вельмі прыемнае — і ўзлятай!", гарэзлівай дзяўчынкі па імені Чырвоны Каптурык, што, бегучы па лесе, прасякнутым яркім ранішнім сонцам, спявала: "А-а, у Афрыцы рэкі — вось такой шырыні!", і многіх іншых кіналюбімцаў дзятвы. У яго стужках здымаліся Ралан Быкаў, Уладзімір Этуш, Рына Зялёная, Уладзімір Басаў, Яўген Еўсцігнееў, Альберт Філозаў, Таццяна Пельтцэр, Павел Кадачнікаў, а песні да іх пісалі Булат Акуджава, Юлій Кім, Юрый Энцін, Аляксей Рыбнікаў, Яўген Крылатаў... І ўсе яны не баяліся ў "дзіцячых" фільмах размаўляць пра вечныя тэмы — любові і смерці, дабра і зла. Леанід НЯЧАЕЎ ніколі не прызнаваў стэрэатыпаў — як у дзіцячым кіно, так і ў жыцці ўвогуле. Чалавек, на фільмах якога вырасла і вырасце яшчэ не адно пакаленне дзяцей, 3-га мая адзначае сваё 70-годдзе.

А яшчэ 20 гадоў таму выйшаў у свет фільм "Не пакідай" — апошняя работа рэжысёра на "Беларусьфільме". Днямі па запрашэнні Музея гісторыі беларускага кіно знаны рэжысёр наведаў Мінск.

Леанід НЯЧАЕЎ: "На "Беларусьфільме" мне далі мянушку..."

Амаль як у жыцці. Толькі ў казцы

"Усе мае казкі — сур'ёзныя!"

— Леанід Аляксеевіч, вы ўсё жыццё здымаеце для "малодшага школьнага ўзросту". А ў вас самога колькі дзяцей?

— Пяцёра: дочкі Насця, Ульяна і Варвара, ад першага шлюбу, — яны ўжо дарослыя, сын Аляксей і дачка Лізавета — ад другога. А нядаўна ў мяне нарадзіўся ўнук — назвалі Савеліем.

— Яны глядзяць вашы фільмы?

— Больш за тое: літаральна ведаюць іх на памяць!

— У дзяцінстве, згадваецца, кожны ваш фільм прымушаў мяне задумацца пра штосьці важнае. "Пітэр Пэн" — пра каханне і смерць, пра сталенне. "Рыжы, шчыры, закаханы" — пра праўду і хлусню. "Чырвоны Каптурык" — пра здрадніцтва. Усе гэтыя фільмы — дзіцячыя, але ж вы размаўляеце з дзецьмі пра вельмі сур'ёзныя рэчы: не баіцеся "грузіць" іх такімі "дарослымі" тэмамі?

— А з дзецьмі АБАВЯЗКОВА трэба гаварыць пра сур'ёзныя рэчы! Я бачу свае фільмы як сямейныя, якія глядзяць і абмяркоўваюць дзеці разам з дарослымі. У кожнага майго героя — свая філасофія. Той жа "Чырвоны Каптурык" — сур'ёзная гісторыя, у тым ліку і пра здрадніцтва. Паляўнічы — самы сапраўдны баязлівец: ён жа здрадзіў усім, нават уласнаму сабаку!

— Як вы, масквіч, трапілі на "Беларусьфільм"?

— Я толькі скончыў ГИТИС, "сур'ёзных" работ у мастацкім кіно мне не давалі, толькі дакументальныя. І я вырашыў арганізаваць скандал: прыходжу да Стэлы Жданавай — кіраўніка студыі "Экран" — і кажу: "Я дыплом абараніў на "выдатна", рэжысёр мастацкіх фільмаў, — а вы мне што даяце здымаць?!" Яна, відаць, вырашыла "правучыць" хулігана, кажа: паедзеш у Мінск даздымаць "Прыгоды ў горадзе, якога няма" — стужку пра тое, як хлопчык трапляе ў свет казачных персанажаў. Я потым чуў, як ёй па тэлефоне нехта пра мяне казаў: за што ты так Нячаева, ён жа добры хлопец. Карціна лічылася правальнай: яе здымкі перад гэтым "заглухлі" ў Адэсе, грошай на працяг не было, і ўсе глядзелі на мяне як на камікадзэ. А я паехаў — і дазняў фільм. І персанажы ў мяне "ажылі": запелі, затанчылі.

Пасля гэтага мне прапанавалі здымаць "Прыгоды Бураціна". Праўда, спачатку гэта павінен быў быць мультфільм. Але ў мяне сама сабой рука "паднялася" — вырваў першую старонку і на чыстым аркушы паперы напісаў: "Мастацкі фільм".

Адно з першых уражанняў ад "Беларусьфільма": прыйшоў раніцай на студыю і бачу — па калідоры ідзе мастак-дэкаратар і грае на гармоніку! Я аказаўся ўніклівым — усё і паўсюль правяраў і кантраляваў сам: і ў касцюмерны цэх зайду, і да дэкаратараў... На "Беларусьфільме" мяне тады празвалі Кашчэем Бессмяротным: я быў худы, з вялікімі вачыма і, да таго ж, пастрыгся "пад нуль".

У Мінску я пражыў 18 гадоў і зняў 13 фільмаў. Гэта быў самы лепшы, самы добры час у маім жыцці. Потым вярнуўся ў Маскву і... — адчуў сябе абсалютна чужым: сябры пастарэлі, былыя сувязі страціліся...

Ліса ў сукенцы і казачны рэалізм

— Калі вы былі такім "парушальнікам спакою", відаць, не магло не абысціся без пэўных праблем на гэты конт?

— Не без таго. На мяне сыпаліся бясконцыя скаргі і ананімкі, і нярэдка я сам быў вінаваты ў гэтым: проста ў твар казаў людзям тое, што пра іх думаў.

Я ўжо не кажу пра экспертныя заключэнні да фільмаў. Пра "Чырвоны Каптурык" пісалі: "Рэкамендуем наблізіць вобраз Чырвонага Каптурыка да арыгінала..." Я доўга спрабаваў зразумець: што ж мелася на ўвазе пад "арыгіналам" — казка Шарля Перо? "Прыгоды Бураціна" давялося везці на прагляд у Маскву. І, нягледзячы на тое, што прагляд скончыўся авацыяй, крытыкі пісалі: "Што гэта за ліса такая — у сукенцы, а кот — у акулярах і без хваста?", а ў сцэне, дзе Бураціна прымотвае Карабаса-Барабаса барадой да сасны, абвінавацілі яго ў здзеках над дарослым чалавекам. Прыдраліся нават да бяскрыўднай сцэны з шапялявым Кажаном, калі ён з крыкамі "Швабода! Швабода!" вылятаў з акна: маўляў, нельга над словам "свабода" здзекавацца.

У "Не пакідай", хаця і здымалі яго ўжо ў 1989 годзе, літаральна "з боем" праходзіла кожная песня, за якую ні вазьміся: "Песенька студэнтаў", "Калі кароль абедае...", "Песенька вандроўных артыстаў" — ва ўсім бачылі крамолу! Нават у словах "прытупілася адчувальнасць гледачоў" знаходзілі нешта "няправільнае". Але ж у маіх карцінах песні патрэбны, як паветра: не будзе іх — і фільм "здзімецца", як паветраны шарык...

— Мастацтва патрабуе ахвяр?

— Усе мае дзеці-акцёры працавалі на здымачнай пляцоўцы, як дарослыя, і нават лепей. Яны звалі мяне "тата Лёня", мы паўсюды ездзілі з імі разам, на адной машыне, былі як вялікая дружная сям'я.

Дзіма Іосіфаў, які іграў Бураціна, — увогуле гераічная асоба. Памятаеце сцэну, дзе Карабас-Барабас яго падвешвае на сасну ўніз галавой? Мы яе здымалі ў Крыме, ля Масандры, — паставілі камеры, "злавілі" сонца ў патрэбнай кропцы, але ў апошнюю хвіліну Дзіміна мама спалохалася: "Як, майго сына на самой справе падвесяць уніз галавой?! Ні за што!" Спрабуем яе пераканаць, але гэта мала дапамагае. Тады я шэптам кажу Дзіму: "Прыдумай што-небудзь", і ён гэтак натуральна хапаецца за жывот і пачынае ныць: "Мама, есці хачу, ажно не магу, — жывот баліць!" Я кажу: бярыце маю машыну і едзьце хутчэй у горад — купіце якой-небудзь каўбасы хлопцу. Толькі яна паехала — мы адразу ж здымаць!.. Дзіма доўга і цярпліва там вісеў, мы закончылі сцэну, згортваем апаратуру, і раптам ён ціхенька так кажа: "А мяне калі адвяжаце?.."

"Пітэра Пэна" здымалі ў Нікіцкім батанічным садзе, у гарах пад Ялтай. А там жа плойма хлапчукоў-акцёраў занята! Яны, шчыра кажучы, разнеслі ўшчэнт усё навокал, бамбук таўшчынёй у руку павыкарчоўвалі! Памятаю, як дырэктар Батанічнага сада гнеўна, са слязамі на вачах, пакляўся: "Ніколі ў жыцці сюды больш не ступіць нага кіношніка!"

А на "Беларусьфільме" для гэтай стужкі пабудавалі сапраўдны пірацкі карабель. Я прыехаў, узняўся на "палубу" — і стала млосна: дошкі ляжаць не ўздоўж бартоў, як у сапраўдным караблі, а ўпоперак! Пытаюся, чаму так, а мне кажуць: караткаватыя дошкі, не хапае даўжыні. Але я ўсё роўна прымусіў перарабіць, бо для мяне ў фільмах вельмі важны гэты самы "казачны рэалізм": усё павінна быць "амаль як у жыцці", толькі ў казцы.

Родная маці не пазнала

— Некаторыя рэжысёры любяць здымацца ва ўласных фільмах у якіх-небудзь эпізадычных ролях. У вас такое здаралася?

— У "Не пакідай" сыграў старога тачыльшчыка: галоўныя героі запытваюць у яго дарогу да палаца, а ён намагаецца папярэдзіць іх пра небяспеку. Я папрасіў грымёраў: зрабіце з мяне такую пачвару, каб родная маці не пазнала. Так і атрымалася — не пазнала: грым, парык, твар у шрамах. Толькі ў канцы сцэны, калі я доўга гляджу ўслед героям, здагадалася: "Ды гэта ж ты, Лёня!" Па вачах здагадалася...

А ў "Прададзеным смеху" паняволі давялося стаць капітанам.

— Як гэта?

— Для здымак мы арандавалі ў Адэсе сапраўдны карабель. Грошай хапіла толькі на адзін дзень, і раптам захварэў хлопец, які павінен быў іграць капітана! Давялося мне апрануць капітанскую форму. А хлопец той быў худзенькі, так што я форму гэтую ледзьве на сябе ўсцягнуў. Так і здымалі — баяўся плячыма паварушыць.

Залаты ключык за 30 рублёў

— Кажуць, у вас — цэлая калекцыя рэквізіту з вашых кінафільмаў?

— Так, у мяне дома захоўваецца шпага Зорнага хлопчыка — мы зрабілі яе самі, плётка-сяміхвостка Карабаса, каралеўскі бакал з "Не пакідай", які ржэ, калі на ім адкрываюць крышку...

— І, канешне, Залаты ключык Бураціна?

— Так. Напрыканцы здымак на яго ішло сапраўднае паляванне — усе хацелі скрасці *(пасміхаецца)*. Ключ быў шыкоўны: сапраўдны, бронзавы. Мне прапаноўвалі проста выразаць яго з фанеры і пакрыць залатой фарбай, але я заўпарціўся, — і майстар выпіліў лобзікам з бронзы сапраўдны твор мастацтва! Кінастудыя заплаціла яму 30 рублёў. Толькі адзнялі апошнія кадры — я тут жа схаваў ключ пад світэр. Мастак па рэквізіце падыходзіць да мяне: "Леанід Аляксеевіч, не бачылі, куды ключык падзеўся?" Не, кажу, не бачыў. Потым, канешне, прызнаўся і па справядлівасці заплаціў "Беларусьфільму" 30 рублёў — у мяне нават распіска ёсць, вісіць дома на цвічку побач з ключыкам: "Прынята ад Леаніда Нячаева за рэквізіт: ключ — 30 рублёў".

— Кажуць, калі дакрануцца да Залатога ключыка, збываюцца ўсе жаданні?

— *(Смяецца.)* Калі шчыра, гэтую прыкмету прыдумала... мая жонка Надзя. Неяк прыходзілі да нас двое рабочых — штосьці рабілі ў кватэры. І вось ужо перад дзвярыма адзін другому кажа: "Не памятаю дакладна, але гэты ключ я недзе бачыў". Другі яму: "Гэта ж Залаты ключык Бураціна". І тут мая жонка кажа: "А вы ведаеце: хто да яго дакранецца — у таго збудзецца яго жаданне". Адзін хлопец паспяшаўся пайсці заводзіць машыну, а другі перад тым, як пайсці, дакрануўся і вельмі сур'ёзна нешта прашаптаў. Прайшло некалькі хвілін, і раптам — званок у дзверы. На парозе — ягоны напарнік: "А можна, і я дакрануся?"

— Што б вы яшчэ хацелі зняць? Пра што марыце, дакранаючыся да Залатога ключыка?

— У дзяцінстве я іграў Ямелю ў спектаклі "Па шчупаковым загадзе". А зараз хачу зняць фільм па матывах гэтай казкі. Мы неяк селі разам з драматургам, пачалі фантазіраваць на гэтую тэму, і такога панавыдумлялі — мог бы блокбастэр атрымацца! Справа за малым: трэба недзе знайсці 5 мільёнаў долараў... *(Пасміхаецца.)*

— А калі б вас зараз запрасілі здымаць на "Беларусьфільм" — вы б згадзіліся?

— Канешне! Кіно — такая "хвароба": да яго прывыкаеш, і потым ужо жыць без яго немагчыма.

— Леанід Аляксеевіч, вы ў сваім жыцці атрымалі нямала ўзнагарод (чаго вартыя хаця б пяць Дзяржпрэмій Расіі!). А якая з іх была самай нечаканай?

— Ордэн Бураціна.

— Ёсць і такі?

— Так, у Зеленадольску Калінінградскай вобласці жыве дзівак, які вырашыў зрабіць свой горад "радзімай Бураціна". Пры гарадской бібліятэцы ён стварыў маленькі музейчык — "Каморку таты Карла", ён жа і заснаваў Ордэн Бураціна. Я быў адным з першых лаўрэатаў гэтага ордэна, разам са мной яго атрымліваў і вядомы грузінскі педагог Шалва Амонашвілі.

Дарэчы, Амонашвілі ж уручаў мне другую незвычайную ўзнагароду: яшчэ за савецкім часам на кінафестывалі ў Кіеве мой фільм "Рыжы, шчыры, закаханы" атрымаў дыплом "За лепшую выхаваўчую казку".

— Дарэчы, пра "выхаваўчыя казкі": любімы многімі фільм "Не пакідай" — гэта казка, у першую чаргу, пра тое, што неабходна жыць "па праўдзе"?

— Так. Зрэшты, усе мае фільмы — пра тое, што неабходна жыць "па праўдзе"...

Дар'я КАСТЭНКА,
студэнтка факультэта журналістыкі БДУ

Пра вайну на сучаснай кінамове

Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" працягвае выконваць свае абяцанні і радаваць аматараў айчыннага кіно прэм'ерамі. Днямі ў сталічным кінатэатры "Кастрычнік" адбылася прэзентацыя новай поўнаметражнай стужкі "Кадэт", знятай рэжысёрам Віталём Дудзіным.

Кінагісторыя распавядае пра курсанта Суворaўскага вучылішча Дзяніса Мяшко, які трапіў у Заходнюю Беларусь першым пасляваенным летам. Там адбываецца забойства першага старшыні сельсавета — яго дзядзькі Сцяпана. Суворавец спрабуе высачыць забойцу (вяскоўцы падазраюць у гэтым Мечыслава Хабенку) і адпомсціць за смерць блізкага чалавека, але на гэтым шляху паўстае шэраг пытанняў і неспадзяванак... У якасці кампліменту карціне варта зазначыць, што ў яе аснову лёг адзін з тых нямногіх сцэнарыяў апошніх гадоў, які не ставіцца да сваіх будучых гледачоў з пэўнай доляй паблажлівасці. Нягледзячы на наяўнасць у ім і любоўнага трохкутніка, і дэтэктыўнай лініі, і тэмы вясковага беларускага побыту, удалая аўтарская работа калектыву сцэнарыстаў дала нам узор якаснага "базісу" для будучага фільма, пазбаўленага серыяльнага спрашчэння сюжэтных ліній і характараў герояў. Дарэчы, заяўка Анатоля Жука (у аснову сцэнарыя лягла яго аповесць "Помста матылькоў") з'явілася на кінастудыі дзякуючы аб'яўленаму конкурсу кінасцэнарыяў, у якім яна была заўважана і адзначана членамі журы.

Тэма выбару галоўнага героя, а разам з тым — і маральна-этычных прыярытэтаў, якія дэкларуе ў сваёй стужцы рэжысёр, адлюстравалася ўжо ў эвалюцыі назвы фільма. У час здымачнага перыяду ён называўся "Метык" — вытворная мянушка ад імя Мечыслаў адной з дзейных асоб, — якога сыграў акцёр Руслан Чарнецкі. Пераадолеўшы патэтычны шлейф уласных роляў у Рускім тэатры, у фільме Чарнецкі здолеў прадэманстраваць нам свой глыбокі акцёрскі тэмперамент, стварыўшы вобраз "добрага дрэннага" хлопца, чый унутраны надлом адбываецца ў час яго дзяцінства і сталення ў ваенныя гады. Для гэтага персанажа свет трымаецца на ўласнай гаспадарцы і доме, і толькі дабрабыт яго сям'і вызначае лад і парадак, і вобраз гэты атрымаўся, з аднаго боку, эмацыянальным у сваёй шчырасці, але, у той самы час, не пафасным і праўдзівым паводле ўнутраных адчуванняў самога героя. Аднак да гледачоў стужка дайшла ўжо пад назвай "Кадэт", выводзячы на першы план персанажа станоўчага — Дзяніса Мяшко ў выкананні Андрэя Сенькіна. І гэта ў выніку надало фільму моцны рамантычны дух: адно на дваіх каханне да Ганны (Паліна Сыркіна), па-дзіцячаму наіўнае імкненне адшукаць і пакараць злачынцу...

Як "Метык" стаў "Кадэтам"

Адметнай рысай гэтага яркага і моцнага ансамбля, дзе, акрамя названых вышэй галоўных герояў, стварылі запамінальныя вобразы Генадзь Гарбук, Аляксандр Суцкавер, Галіна Кухальская, Святлана Кажамякіна і шэраг іншых акцёраў, з'яўляецца той факт, што ў фільме заняты толькі айчынныя "кадры". Гэткая рэжысёрская пазіцыя — прынцыповая. Тым не менш, сам Віталь Дудзін пад час прэзентацыі заклікаў не акцэнтаваць увагу выключна на гэтым факце. І гэта цалкам слушна, бо няўжо толькі тым адметны фільм, што рэжысёр абышоўся ўласнымі сіламі Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм"? Так, мы прызвычаіліся чуць, што, маўляў, нібыта без расійскай ці якой-небудзь іншай заезджай "зоркі" наша стужка страціць пэўную долю сваёй таварнай прывабнасці, і спадзяёмся на запрошанага "варага" ў якасці кампенсацыі недахопаў сцэнарыя ці рэжысуры. Аргументуем жа тым, што на "Беларусьфільме" так павялося здаўна, і сёння ўжо, бадай, стала своеасаблівай традыцыяй. А між іншым, падобная рэжысёрская пазіцыя, акрамя грамадзянскага пафасу і сцвярджэння таго, што нашы акцёры не горшыя за іншых, мае ў сабе і яшчэ адзін непрыхаваны нюанс. Такім чынам — даючы нашым акцёрам працу ў беларускіх фільмах — адбываецца прамая падтрымка айчыннага кінематографа. І, хочацца спадзявацца, — стварэнне сітуацыі, альтэрнатыўнай беззваротнаму адтоку акцёрскіх кадраў у расійскія серыялы. (Хаця выканаўца галоўнай ролі Ганны Паліна Сыркіна ўжо атрымала некалькі такіх прапаноў.)

Зрэшты, у справе пошукаў крытэрыяў для вызначэння "нацыянальнай прыналежнасці" той ці іншай стужкі вельмі шмат падводных камянёў. Дастаткова адно толькі адпаведнай краіны вытворчасці, альбо павінны быць выкананы яшчэ нейкія своеасаблівыя патрабаванні? Аднак справа зусім не ў крытэрыях. Да сённяшняга часу айчынныя кінакрытыкі і кінадзеячы не могуць адказаць на пытанне: чым жа з'яўляецца праславутае "беларускае кіно"? Аддаючы перавагу тэрміну "брэнд", яны спрабуюць прыпісаць сабе манаполію на ваенную тэматыку. А між тым, дастаткова адной дробязі: не забывацца, што прафесіяналізм не залежыць ад статусаў і брэндаў, а пацвярджаецца кожны раз у канкрэтнай рабоце — тых стужках, якія выходзяць на экраны нашых кінатэатраў. І, акрамя апелявання да мінулага, неабходна вельмі тонка адчуваць і дзень сучасны — тую сацыяльна-інфармацыйную прастору, у якой жывуць людзі пачатку XXI стагоддзя. Не, я не заклікаю да сляпога капіравання амерыканскіх ці расійскіх узораў "кінавайнушак", — гэты шлях наўрад ці выведзе наша кіно ў канструктыўнае рэчышча. Але ж прынцыпы найноўшага мыслення і ўспрыняцця інфармацыі, адрозныя ад таго, што панавалі ў 70-я гады мінулага стагоддзя, сучасную кінамову ігнараваць не толькі нельга, але і шкодна: кансервуючыся ў прыёмах, эфектных і дзейсных у мінулым, мы самі сабе зачыняем дарогу ў кінабудучае.

Разважаючы пасля заканчэння фільма пра ўбачанае, злавіла сябе на думцы, што на працягу прагляду ў мяне ніводнага разу не ўзнікла жаданне "развеяцца", пераключыць сваю ўвагу з кінематаграфічнай дзеі на штосьці іншае, — і гэтае ўменне трымаць глядацкую ўвагу для стужкі з'яўляецца вялікім і важным "плюсам". Але ж, мушу канстатаваць, што ніводная хвіліна экраннага часу не дала мне падстаў "западозрыць" фільм Віталя Дудзіна ў тым, што гэта — сёлетняя прэм'ера і менавіта "новае беларускае кіно": з падобным поспехам "Кадэт" мог бы "нарадзіцца" і некалькімі дзесяткамі гадоў раней. Што гэта — працяг кінематаграфічных традыцый ці закансерваваная непаваротлівасць айчыннага кінамыслення?..

Фота Юрыя ІВАНОВА

На здымку: кадр з фільма "Кадэт".

Працэс пайшоў!

Сцэнаграфічная палітра бягучага тэатральнага сезона

25 красавіка ў Музеі гісторыі беларускага кіно адкрылася выстаўка работ тэатральных мастакоў "Вынікі сезона 2008 — 2009". Калі летась айчынныя сцэнографы радаваліся ўжо таму, што справаздачныя выстаўкі змаглі-такі адрадзіцца, і прадстаўлялі на суд наведвальнікаў лепшыя, на іх погляд, творы, то сёлета яны былі пастаўлены ў больш жорсткія рамкі: работы для экспазіцыі мусілі быць створаны ў бягучым сезоне.

Звычайна глядач сутыкаецца з работай мастака-сцэнографа толькі на прэм'еры — ужо ў выглядзе, прынятым тэатрам. Але ж не меншы, а для спецыялістаў — прынцыпова больш важны, інтарэс прадстаўляюць макеты і эскізы да спектакляў, якія дазваляюць убачыць, зразумець эвалюцыю мастакоўскай думкі, улавіць ідэю прасторавага вырашэння і ўвасаблення таго ці іншага драматургічнага твора. Яшчэ і з гэтай прычыны было цікава ўбачыць макеты да гучных спектакляў апошняга часу.

Сцэнографы прадэманстравалі багатую палітру сваіх работ на сцэнах большасці сталічных тэатраў. І прыемна адзначыць, што ў полі іх інтарэсаў — не толькі драматычныя спектаклі, але і лялечныя, работа над тэатралізаванымі шоу. Да таго ж, на выстаўцы прадстаўлены плён супрацоўніцтва нашых мастакоў тэатра з калектывамі блізкага і далёкага замежжа: Расіі і Славакіі, украінска-беларускімі творчымі праектамі.

А вось айчынныя рэгіёны, на жаль, аказаліся прадстаўленыя няпоўна: усяго толькі некалькімі макетамі да пастановак у Магілёўскім абласным драматычным тэатры ("Апошняя жанчына сеньёра Хуана" Л.Жухавіцкага, сцэнаграфія — Андрэя Меранкова, і "Вераб'іная ноч" А.Дударава паводле У.Караткевіча, сцэнаграфія — Алесі Снапок-Сарокінай), Гродзенскім абласным драматычным тэатры ("Ноч Гельвера" І.Вілкіста, сцэнаграфія — Таццяны Сакалоўскай), Слонімскім беларускім драматычным тэатрам ("Спакуса" А.Якімовіча, сцэнаграфія — Аляксандра Толкача) а таксама эскізамі і фотаздымкамі да оперы "Яўгеній Анегін" П.Чайкоўскага Маладзечанскага маладзёжнага музычнага народнага тэатра (сцэнаграфія — Дзмітрыя Мохава).

Прыемна адзначыць, што гэтым разам мастакоўская моладзь ужо не выглядала сціпла на фоне сваіх старэйшых калег, а была годна прадстаўлена работамі згаданых вышэй Алесі Снапок-Сарокінай, Ігара Анісенкі, Дар'і Волкавай, Вольгі Мацкевіч, Андрэя Меранкова і іншых. І, як сказаў пад час адкрыцця мастак Дзмітрый Мохаў, сёння ўжо не маладыя сцэнографы, а старэйшае пакаленне мусіць шукаць спосабы "ўпісацца" ў новую сцэнаграфічную плынь. Нягледзячы на сціпласць сёлетняй выстаўкі, яна ўсё ж дала магчымасць "на іншых паглядзець ды сябе паказаць", а акрамя гэтага — дазволіла шырокаму колу тэатральнай грамадскасці скласці больш поўную карціну тых працэсаў, што адбываюцца сёння ў беларускай сцэнаграфіі, выяўляючы яе перспектыўныя шляхі і накірункі развіцця.



Фота Юрыя ІВАНОВА

На здымках: 1. Дар'я Волкава. Макет да спектакля "Нататкі звар'яцелага музыканта" паводле М.Гогаля; 2. Уладзімір Чарнышоў. Эскіз да спектакля "Навальніца" паводле А.Астроўскага.

Пра што распавяла выстаўка касманаўта

Космас, зямля і мора Аляксея Ляонава

Я сустракаўся з Аляксеем Архіпавічам ЛЯОНАВЫМ тройчы: 22 і 23 красавіка — у Нацыянальным мастацкім музеі пад час агляду экспазіцыі ягонай персанальнай выстаўкі "Зямны і касмічны жывапіс" і класічнай музейнай калекцыі, а таксама на прэс-канферэнцыі перад вернісажам. Размова ішла пра рознае. Адказы на многія пытанні, якія мяне цікавілі, я вырашыў згрупаваць па раздзелах, каб чытачу лягчэй было арыентавацца ў вехах жыцця і творчасці гэтай унікальнай асобы.

Але перш за ўсё хачу даць слова Валянціне Уладзіміраўне Церашковай, якая разам з Аляксеем Архіпавічам прыбыла ў Мінск на гэтае святочнае мерапрыемства.

Вось што сказала "Чайка" — першая ў свеце жанчына-касманаўт: "Я сардэчна ўдзячная тым, хто прыйшоў на выстаўку майго блізкага сябра і калегі, які цудоўна паказаў у сваім жывапісе, наколькі прыгожая наша Зямля, якая яна малая ў прасторы Сусвету і таму такая дарагая для чалавецтва… Ляонаў першым у гісторыі чалавецтва выйшаў у адкрыты космас. Было шмат нязведанага. Было шмат цяжкасцей. Але ён мужна пераадолеў іх, што гаворыць пра яго высокі прафесіяналізм лётчыка-касманаўта. З космасу ён бачыў нашу планету, і ў сваіх творах паказаў яе прыгажосць, якую трэба берагчы як зрэнку вока. Мы, касманаўты, ведаем: чым далей ракета адносіць нас ад Зямлі, тым бліжэй і радней Зямля для нас становіцца. І разумеем: наколькі вялікае тое, што нас, людзей, аб'ядноўвае, і наколькі мізэрнае тое, што нас раз'ядноўвае.

Я бязмежна рада, што выстаўка Аляксея Архіпавіча адкрылася ў Год культуры Расіі ў Беларусі, і гэта сапраўды адна са знакавых падзей у культурным жыцці нашых краін, І яшчэ мне прыемна, што я адчуваю сябе тут, у Беларусі, як дома. Бо мае родавыя карані — тут, у гэтай слаўнай і гераічнай зямлі…"

Дадам. Сям'я Церашковых — дзядуля Аксён, бабуля Матрона, мама Алена Фёдараўна — родам з вёскі Ерамееўшчына Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці, у галодныя 20-я гады пераехала з Беларусі на Яраслаўшчыну, дзе ў сяле Масленнікава і нарадзілася першая жанчына-касманаўт. Бацька — родам з Бялыніцкага раёна Магілёўшчыны — знік без вестак у 1940 годзе у час савецка-фінскай вайны. Дзякуючы міністру абароны СССР Д.Ц. Язаву, Валянціна Уладзіміраўна ў 1988 годзе адшукала месца пахавання бацькі — брацкую магілу. Урну з той зямлёй прывезла ў Маскву і разам з мемарыяльным знакам устанавіла на могілках, побач з помнікам мамы, якая пайшла з жыцця годам раней, у 1987-м. Так што Валянціна Церашкова — прамая наша зямлячка…

Аднак і ў героя майго расповеду — Аляксея Ляонава — ёсць асаблівыя духоўныя повязі, што лучаць яго з Беларуссю, повязі, якія сягаюць у яго дзяцінства. Ён аб гэтым раскажа. І ўвогуле: які ж ён, касманаўт Лявонаў, — як асоба, як мастак — у простых чалавечых стасунках? Што яго цікавіць, радуе, хвалюе, турбуе?

Пра бацькоўскі дом і драму сям'і

— Я — сібірак. Нарадзіўся ў маленькай вёсцы Лісцвянка Кемераўскай вобласці. Праз месяц, 30 мая, мне, "старому Мазаю", споўніцца 75… Вось так доўга я жыву на свеце. Пабачыць і зведаць многа чаго давялося. У жыцці кожнага чалавека бываюць крутыя павароты, калі можна ўзляцець, альбо ўпасці і не падняцца. У мяне ў жыцці былі два такія павароты, з якіх я ўсё ж выйшаў з гонарам, не кажучы ўжо пра тыя складанасці, што выпалі на маю долю цягам двух касмічных палётаў. Але гэта — асобная гісторыя.

Дык вось, трагічны 1937-ы. Мне тры гадкі. Сталінскія рэпрэсіі ідуць поўным ходам. Закранулі яны і нашу сям'ю. Мы жылі далёка, у цэнтры Сібіры. Бацьку майго забралі ў турму без суда і следства, а маму і яе васьмёра дзяцей проста выкінулі з дому. Уся маёмасць, уключаючы каструлі, патэльні і нават мае штонікі, разабралі суседзі як у сям'і "ворагаў народа". (Дарэчы, мая мама, настаўніца літаратуры, вучыла ў школе дабрыні і розуму дзяцей тых суседзяў.) Мая старэйшая 19-гадовая сястра якраз у гэты час абжылася ў Кемераве, дзе будавалася вялікая ЦЭЦ. І там сустрэла хлопца — Антона Платонавіча Хадановіча, беларуса, родам з Магілёва. Працаваў ён возчыкам. Яны пакахалі адно аднаго, ажаніліся. І тут такая сямейная трагедыя: бацька — "вораг народа", а мы — ЧСВН, інакш кажучы "члены сям'і ворага народа". Як да гэтага паставіцца? І раптам мама атрымлівае з Кемерава ліст ад зяця: "Дарагая мама! — піша ён (хоць маму ніколі не бачыў). — Прыязджайце да нас усёй сям'ёй! Мы будзем жыць разам! Мы вас не кінем!" І вось мы — мама і ўсе дзеці, — на санках, укрытых бравэркай, прыбылі ў Кемерава на вуліцу Інтэрнацыянальную, 15, дзе ўсім кагалам пасяліліся ў бараку ў 16-метровым пакоі! Якое ж добрае сэрца трэба мець, каб зрабіць так, як Антон Платонавіч! Для мяне ён стаў другім бацькам і нашым адзіным карміцелем: і па сёння не разумею, як ён умудраўся пракарміць 11 чалавек!

Праз 2 гады бацьку выпусцілі з турмы, зняўшы з яго ўсе абвінавачванні, і нашай сям'і прадаставілі ў тым жа бараку ажно два пакоі па 18 метраў… Доўгія гады я ўсё думаў адшукаць у Магілёве родзічаў Антона Платонавіча, ды як іх адшукаеш пасля такой страшнай вайны?.. Але тое, што ён зрабіў для нас, для мяне застаецца прыкладам чалавечай годнасці і вялікай любові да людзей. Такое не забываецца…

У 1957 годзе я ўпершыню пазнаёміўся з Беларуссю, калі з Калінінграда ехаў праз Мінск на Украіну — паступаць у Чугуеўскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў.

У Мінску ў чаканні наступнага цягніка давялося затрымацца на суткі. Пераначаваў на… прывакзальнай клумбе, паспеў пазнаёміцца з горадам і пешшу прагуляўся аж да парку Чалюскінцаў. Ну, а потым на Беларусі я бываў часта, і ў мяне тут шмат сяброў.

Другі паварот у маім жыцці здарыўся на пачатку 90-х. Тады, ужо будучы двойчы Героем, генерал-маёрам авіяцыі, я з'яўляўся дэпутатам Массавета. І ў сваёй праграме выказаў неймаверныя для таго часу патрабаванні: стварыць, напрыклад, Акадэмію навук РСФСР (чаму іншыя рэспублікі такія акадэміі маюць?), Акадэмію мастацтваў Расіі і Кампартыю Расіі. Скончылася ўсё тым, што мяне, за 5 гадоў да сканчэння вайсковай службы, проста звольнілі з арміі. Я быў у разгубленасці: сям'я, пенсія ў 5 тысяч рублёў — гэта, не паверыце, менш, чым кошт пляшкі гарэлкі! І вось тады дапамаглі мае сябры-банкіры. Адзін з іх калісьці працаваў з Сяргеем Паўлавічам Каралёвым, і мы былі раней знаёмы. Словам, яны і прапанавалі мне работу ў знакамітым расійскім банку. Пэўны вопыт дзейнасці ў гэтай спецыфічнай галіне ў мяне як у былога супрацоўніка ваенна-прамысловага комплексу быў. А далей усё пайшло сваім парадкам…

Аб прафесіі мастака. Чаму пішу Космас

— Калі б не стаў касманаўтам, дык сваё жыццё прысвяціў бы жывапісу. Гэта дакладна. Пачаў маляваць у дзяцінстве. Памятаю, у 8 гадоў намаляваў вялікі грыб у лесе і пад ім — маленькіх дзетак з зялёнай травінкай. Настаўніца і дырэктар школы вельмі хвалілі мой "шэдэўр": "Будзеш мастаком!". З тых часоў і малюю. У якіх бы гарадах і краінах ні быў — не развітваўся з эцюднікам і блакнотам. А пасля палётаў у космас, зразумела, тэма касмічнай прасторы заняла ў маёй творчасці асаблівае месца, хаця не менш люблю пісаць марыны, рамантычныя марскія пейзажы і караблі, а таксама лірычныя пейзажы настрою, часта з настальгічным адценнем.

У маіх касмічных кампазіцыях усё абсалютна дакументальна, інакш кажучы, пісаў тое, што бачыў у космасе ці з космасу. Мая "зоркавая карта" расквечана не штучнымі кветкамі, як гэта прынята, а сапраўднымі, "касмічнымі". Для гэтага я распрацаваў сваю методыку, па якой старанна замяраў першапачатковы колер зямной паверхні і вызначаў патрэбныя мне каардынаты гэтай "колеравай" кропкі ў залежнасці ад асаблівасцей зроку. Вызначыў пэўныя тайны блакітнага поясу Зямлі і колеравыя асаблівасці свячэння планет і зорак. Усё гэта ўбачыце ў маім жывапісе, у такіх творах, як "Выхад у адкрыты космас. 18 сакавіка 1965 года", "Усход-2" або ў панарамнай карціне "Дзесьці тут узнікла чалавецтва". Аднак у чарговы раз паўтаруся: як бы прыцягальна і незвычайна ні было ў космасе, прыгажэй за нашу планету Зямля нічога няма…

Чаму пішу мора

— Мора я палюбіў, калі ў юнацтве жыў у Калінінградзе. Так што ўсё пачалося з Балтыкі. Рана ўпадабаў Айвазоў-

А.Ляонаў. "Выхад у адкрыты космас. 18 сакавіка 1965 г.".

А.Ляонаў. "Стары млын паблізу Мінска".

скага, потым — Рокуэла Кента і Мікалая Рэрыха: усе яны блізкія мне асаблівым рамантычным настроем, дзіўным пачуццём прасторы марской і зямной стыхій. Пазней захапіўся гісторыяй легендарных расійскіх караблёў з іх гераічнымі, часта трагічнымі лёсамі. Па знойдзеных мной чарцяжах дакладна "ўзнавіў" гэтыя караблі на сваіх палотнах і малюнках. У экспазіцыі я прадставіў цыкл твораў аб доўгім шляху фрэгата "Дыяна" з Кранштата вакол зямнога шара цераз Атлантыку і Індыйскі акіян да Японіі, дзе 150 гадоў таму карабель загінуў у стыхіі цунамі. З рэшткаў карабля маракі, што атабарыліся ў японскім горадзе Хеда, пабудавалі аднайменную шхуну, на якой тыя, хто застаўся ў жывых, вярнуліся на радзіму. Я быў у гэтым горадзе, наведаў могілкі, дзе пахаваны нашы маракі, што памерлі на чужыне, і быў вельмі ўсхваляваны: дагледжаныя магілы акаймаваны гранітам, паўсюль — вазачкі з жывымі кветкамі, да кожнага надмагілля падведзены кранікі з вадой... І ўсё гэта ашчадна захавана...

На выстаўцы вы ўбачыце карціну, прысвечаную трагічнаму зыходу палярнай экспедыцыі Георгія Сядова, калі вялікі гідрограф і палярны даследчык у 1912 годзе вымушаны быў кінуць заціснутае ільдамі судна "Святы Фока" і паспрабаваў на сабаках дасягнуць Паўночнага полюса. Дзе ён дакладна загінуў — невядома. І яшчэ адна карціна: на трывожным фоне флагман касмічнага флоту "Касманаўт Юрый Гагарын". Калі распаўся Савецкі Саюз, гэты карабель знаходзіўся ў адэскім порце, адкуль не расійскім бокам быў, на вялікі жаль, прададзены... А гэта быў адзіны ў свеце карабель водазмяшчэннем 44 тысячы тон! З яго ж можна было зрабіць і унікальны музей, і гатэль...

А.Ляонаў. "Флагман касмічнага флоту "Касманаўт Юрый Гагарын".

Чаму пішу пейзажы

— Лірычныя пейзажы — таксама мая сталая любоў. На выстаўцы я прадставіў своеасаблівы пейзажны трыпціх, прысвечаны маёй малой радзіме — вёсцы Лісцвянка. Некалькі гадоў таму я наведаў тыя месцы, знайшоў сцежку і рачулку, якія памятаў з дзяцінства, сустрэў дарагіх землякоў, агледзеў і напісаў бацькоўскі дом, дзе нарадзіўся... Вельмі пранізлівае было адчуванне ад убачанага...

Некаторыя пейзажы я пісаў на паляванні ў Спас-Клепіках з Юрыем Гагарыным 22 кастрычніка 1967 года: два эцюды з аднаго і таго ж месца я напісаў з часавай розніцай у 30 хвілін: ядраны, зялёны — гэта яшчэ світанак; другі — гэта ўжо ранак, ледзь цяплейшы, мяккі. Вось такі імпрэсіянізм... Адзін пейзаж я напісаў з натуры пад Мінскам у 2003 годзе — у Дудутках, назваў яго "Стары млын паблізу Мінска". Можа быць, калі-небудзь яшчэ папішу прыгажуню Беларусь... Паказваю і тое, што бачыў у Сірыі, ЗША, Венгрыі, Чарнагорыі, Італіі, Шатландыі, Нідэрландах. А самыя раннія творы, прадстаўленыя ў экспазіцыі, пазначаны 1958 годам: гэта "Адэса. Ланжэрон. Заход сонца" і "Адэса. Ланжэрон. Месячная ноч". Ёсць на выстаўцы і графіка: каляровая літаграфія "Seagull (Чайка)", прысвечаная Валянціне Церашковай і жанчынам-касманаўтам; акварэльны партрэт Валерыя Быкоўскага з нагоды 40-годдзя яго палёту ў космас і гэтак далей.

Вось пазнаёміўся з пастаяннай экспазіцыяй вашага музея. І скажу так: я пабачыў нямала буйных галерэй свету, але беларускі музей — адзін з самых цудоўных. Выдатная калекцыя жывапісу і скульптуры: мяне ўразілі карціны Айвазоўскага, Багалюбава, Шышкіна, Макоўскага, Пукарава, Рэпіна, Малявіна, скульптуры Лансэрэ і Канёнкава, старажытнае і сучаснае беларускае мастацтва. Любая краіна можа пазайздросціць збору такіх высакаякасных твораў айчыннай і сусветнай класікі...

* * *

На маё апошняе паўжартаўлівае пытанне: "Што вам, Аляксей Архіпавіч, як чалавеку, які пабываў у космасе, гавораць зоркі наконт будучыні нашых краін — Беларусі і Расіі? Як мы будзем жыць далей?" — Ляонаў адказаў: "Нічога мне зоркі не кажуць, я з імі не размаўляю, я размаўляю з разумнымі людзьмі, якія гавораць, што ўсё будзе залежаць... ад разумных людзей. У нас з вамі поўнае ўзаемаразуменне, дзякуй Богу, і жорсткіх межаў паміж нашымі дзяржавамі няма. Я ў гэта вельмі веру. Паводле духоўнага менталітэту, па ўсіх іншых параметрах вы, беларусы, у нас — блізкія, і мы, расіяне, у вас таксама. Я не кажу пра іншыя краіны, я кажу пра тое, што адчуваю сёння, калі знаходжуся на беларускай зямлі, якая мне такая ж дарагая, як і Расія. Іншага не дадзена..."

Барыс КРЭПАК
Фота Юрыя ІВАНОВА

А.Ляонаў. "Дзесьці тут узнікла чалавецтва".

Прысвячэнне радзіме Мікалая Ліханенкі

М.Ліханенка. "Холмскія вароты".

Тэмперамент мядовай расы

"Родная зямля" — так называецца юбілейная выстаўка магіляўчаніна Мікалая Ліханенкі ў мінскім Палацы мастацтва, прысвечаная 60-годдзю творцы.

Ураджэнец вёскі Цінькава, што на Крычаўшчыне, ён у 1971 годзе скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута, дзе вучыўся ў выдатных педагогаў Фелікса Гумена і Івана Сталярова, заснавальнікаў так званай віцебскай школы акварэлі. Пасля заканчэння вучобы Мікалай Іванавіч вярнуўся на радзіму, у Магілёў, дзе і сёння паспяхова працуе ў акварэльным жывапісе, а таксама выкладае ў мясцовым вучылішчы культуры.

Колькі соцень акварэлей створана за амаль што 40 гадоў творчасці, мабыць, аўтар і сам не ведае. Але практычна ўсе яны прысвечаны роднай прыродзе, малой радзіме і наогул усёй той прыгажосці і паэзіі жыцця, што бачыць мастак усюды, куды б яго не закінуў творчы лёс. Таму Мікалай так любіў вандраваць з эцюднікам не толькі па Беларусі, але і па розных маляўнічых мясцінах былога Савецкага Саюза.

Акварэль М.Ліханенкі — насычаная і свежая, як мядовая раса, энергічная і тэмпераментная. Часам яго акварэлі, асабліва апошнія, дасягаюць "карціннай" сілы, як у лістах "Скрыпень", "Задуменныя дні восені", "Лістапад", "Вялікая Губа"; часам глядзяцца як добра скампанаваныя эцюды, напісаныя непасрэдна з натуры. Лад вялікіх, як правіла, лістоў прадвызначаны характарам матэрыялу: форма, каларыт, фактура ўзнікаюць у энергічным руху пэндзля з боку ў бок ліста — так нараджаецца зразумелая сістэма плоскасцей-прастораў, якія то перасякаюцца, то перакаюць адна ў адну, то разрываюцца так, што ў прасветах адкрываюцца невядомыя, невымоўныя далячыні. Усё гэта складае духоўную прастору мастацтва Ліханенкі, дзе ўвасабляюцца яго думкі, пачуцці, сардэчныя радасць і боль, а часам — вострая настальгія па дзяцінстве і юнацтве.

Вось што кажа пра гэта сам мастак: "Усё, што акаляла мяне тады, здавалася напоўненым сэнсам, гармоніяй і прыгажосцю. Вельмі хацелася зразумець гэтую прыгажосць і перадаць пачуцці, якія перапаўнялі мяне, іншым людзям. Жаданне быць мастаком прыйшло менавіта ў гэты час..."

Так, ён, Мікалай Ліханенка, стаў добрым мастаком. Можа, адным з найбольш паэтычных у нашай краіне менавіта ў гэтай галіне пейзажнага жывапісу (акварэль я залічваю да жывапісу, а не да графікі), таму што яго лепшыя работы напоўнены высокай лірыкай, цёплым светам, добрым настроем, жыццялюбствам.

Але, па вялікім рахунку, асабіста мне хацелася б пабачыць у творчасці мастака апошніх гадоў больш нейкай "эксперыментальнай" навізны, свежых пошукаў не толькі ў "сюжэтах", але і ў акварэльнай "тэхналогіі". Калі я ішоў з выстаўкі, мяне не пакідала пачуццё, што і ранейшыя творы, скажам, 1980-х гадоў (іх у экспазіцыі, праўда, няшмат, але я добра ведаю творчасць мастака і той пары, і 1970-х гадоў), і апошнія, новага стагоддзя, — зроблены на адной пачуццёва-эмацыянальнай і тэматычнай струне. А вельмі хацелася б паслухаць і трошкі іншую музыку "новага часу", бо творчы патэнцыял у Ліханенкі вельмі высокі... Хаця глядач можа і не пагаджацца з такой пастаноўкай пытання: як кажуць, ад дабра дабра не шукаюць. Магчыма...

Б.К.

Свабода эксперыменту...
...і эцюднік за плячыма

У Нацыянальным мастацкім музеі працуе выстаўка твораў Мікалая Аўчыннікава, які з'яўляецца непаўторным мастаком-акварэлістам, што звязаў сваё творчае жыццё з горадам — культурным спадарожнікам Мінска — Маладзечнам.

Ён не менш вядомы ў сталіцы, чым у горадзе, дзе жыве, працуе, з якога чарговы раз выязджае ў творчыя падарожжы па Беларусі і за яе межы. Мастак актыўна заявіў пра сябе з сярэдзіны 1970-х як прадстаўнік так званай віцебскай школы акварэлі, вучань Ф.Гумена і І.Сталярова, дэманструючы неверагодную тэхнічную віртуознасць, свабоду эксперыментаў і маляўнічых імправізацый. Тэмы твораў — шматлікія гістарычныя мясціны Беларусі: "Ракуцёўшчына", прысвечаная М.Багдановічу, "Залессе. Паланез" — Агінскаму. Паказвае Аўчыннікаў і помнікі археалогіі, культуры ды архітэктуры XII — XVIII стст.: "Спаса-Еўфрасіннеўская царква. Полацк", "Навагрудак", "Мядзельскае гарадзішча", "Млын у Гарадку". Гэтыя і іншыя рэгіёны мастак абышоў уздоўж і ўпоперак з эцюднікам за плячыма, спазнаўшы радасць ад новых уяўленняў, спасціжэнняў і адкрыццяў.

Рамантычныя матывы з архітэктурнымі дамінантамі, помнікамі мінуўшчыны, вясковай драўлянай архітэктурай ён таксама знаходзіць і за межамі роднай краіны, пра што расказваюць цыклы "Драўлянае дойлідства Поўначы" і "Салавецкія астравы".

У апошняе дзесяцігоддзе Мікалай Аўчыннікаў спрабуе свае творчыя пошукі перанесці за межы рэальных асацыяцый. Гэта свет цалкам містычны, экспрэсіўна-абстрактны. Жывапісец працуе на вялікіх памерах і яго фігуратыўныя кампазіцыі серыі "Прадчуванне" ўспрымаюцца бясконцым акіянам жывапісных хваляў, стыхійных пачуццяў. Дзякуючы акварэльнай абагуленасці мастаку ўдаецца парушаць межы рэальнага і вобразнага ды ствараць паэтызаваныя нацюрморты, краявіды і віртуозныя фармальныя кампазіцыі.

М.Аўчыннікаў. "Каляровыя сны пасля пленэру, прысвечанага Язэпу Драздовічу. № 1".

Дадзеная экспазіцыя ўключае найбольш характэрныя для Аўчыннікава акварэльныя творы, дзе ён застаецца пазнавальным і гарманічным.

Людміла НАЛІВАЙКА, кандыдат мастацтвазнаўства

Палацава-паркавы ансамбль і фестываль Кіраўшчыны маюць стаць галоўным духоўным стрыжнем раёна

Што значыць “Пайшлі ў Палац!” па-жыліцку?

1.

2.

3.

4.

Базіс рэгіёна: установа культуры ў “інтэр’еры” вёскі

“К” чарговы раз вяртаецца да надрукаванага. У № 12 нашай газеты за 2007 год быў змешчаны артыкул “Жыліцкі палац як рухавік перамен”, дзе гаворка ішла пра помнік сядзібнага дойлідства Магілёўшчыны XVIII — XIX стагоддзяў, адметны захаванасцю ўнутранага ўбрання. Палацу нададзена першая катэгорыя ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей, ён уключаны ў Дзяржаўную інвестыцыйную праграму. Стопакаёвая летняя рэзідэнцыя паноў Булгакаў разам з часткай старадаўняга парку (пра іх гісторыю “К” падрабязна пісала два гады таму) перайшла на баланс аддзела культуры Кіраўскага райвыканкама. На сёння ва унікальных палацавых сценах дзейнічаюць дзіцячая школа мастацтваў, музей, бібліятэка. Але некаторыя сядзібныя памяшканні знаходзяцца папраўдзе ў аварыйным стане. За рэалізацыю Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы па аднаўленні Жыліцкага палацава-паркавага комплексу ўзяліся ў сакавіку. Пачала ажыццяўляцца задума начальніка аддзела культуры Кіраўскага райвыканкама Тамары Галубоўскай па пераўтварэнні вёскі Жылічы ў адметны духоўна-турыстычны цэнтр не толькі раёна і вобласці, але і рэспублікі. Словам, справа зрушылася. Менавіта ёй рэдакцыя найперш і зацікавілася. І логіка журналісцкай увагі тут, як падаецца, цалкам абгрунтаваная. Амаль даведзеныя да ладу палацавыя аб’екты маюць ужо Нясвіж і Мір, адрэстаўраваны Палац Пацёмкіна займеў Крычаў... Чаму б пашанотны спіс не прадоўжыць Жылічам? І няхай гаворка — пра вёску, якая знаходзіцца ўдалечыні ад шумных аўтатрас: прасёлкавыя дарогі, пры жаданні, бываюць не менш ажыўленымі, чым прыгарадныя шашэйкі. Вёска ж Жылічы, мяркуючы па аператыўнасці складання турыстычных фотасайтаў, вабіць усё большую колькасць аматараў напаўзабытай і пакуль як след “нераскручанай” беларускай даўніны.

Першы разбег і першы скачок

Скачок тады ўнушальны, калі разбег вывераны. Прынамсі, спартыўная практыка ў гэтым пераконвае. Дык вось, “разбег” перад аднаўленнем сядзібнай забудовы ў Жылічах быў, як падаецца, грунтоўным. У 2005 — 2006 гадах Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь выдаткавала першыя сродкі на інжынерна-тэхнічнае абследаванне Палаца. У 2007-м сума на інжынерныя і лабараторныя работы склала 400 мільёнаў рублёў. На падставе дадзенага аналізу летась была падрыхтавана праектна-каштарысная дакументацыя на правядзенне першай чаргі рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ. Гэтая стадыя падрыхтоўкі з улікам правядзення інжынернай экспертызы абышлася амаль у 470 мільёнаў рублёў. Самы час згадаць, што заказчыкам палацавага аднаўлення выступае унітарнае вытворчае камунальнае прадпрыемства “Цэнтр па рэстаўрацыі” Магілёўскага аблвыканкама. Усе дзеянні ён узгадняе з упраўленнем па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Паводле інфармацыі дырэктара “Цэнтра па рэстаўрацыі” Наталлі Кузняцовай, на сёлетняе фінансаванне аб’екта прадугледжваецца два мільярды рублёў: адзін — са сродкаў рэспубліканскага бюджэту, другі — з бюджэту абласнога. У сакавіку “Цэнтр па рэстаўрацыі” заключае дамовы з “Праектрэстаўрацыяй” на распрацоўку архітэктурнага праекта палацава-паркавага ансамбля.

Паколькі каштарыс гатовы на аднаўленне першай чаргі — а гэта корпус, дзе месцілася школа мастацтваў, таму за працу, згодна з дамовай, бярэцца ў тым жа сакавіку ЗАТ “Будпраектінвест”. Арганізацыі, згодна з дамовай, трэба асвоіць, па словах начальніка ўпраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Анатоля Сінкаўца, 4,6 мільярда рублёў. Будаўнічамантажныя работы завершацца ў жніўні 2010-га. Што канкрэтна “Будпраектінвест” плануе выканаць? Поўную замену сталяркі, узмацненне падмурка, рэстаўрацыю фасаднага аздаблення, замену інжынерных сетак, уладкаванне маналітных перакрыццяў і шатровага даху з ацынкаванай сталі...

Частка сёлетняга двухмільярднага фінансавання “рэканструкцыі з рэстаўрацыяй і прыстасаваннем” — 15 мільёнаў рублёў — пайшла на складанне праектна-каштарыснай дакументацыі і рэстаўрацыі паўднёвага корпуса. Удакладню: першая чарга работ звязана з уладкаваннем гасцініцы, другая — з аднаўленнем музея, бібліятэкі, з прыстасаваннем памяшканняў пад карцінную галерэю... Работы ў першым квартале фінансава падмацаваны толькі з абласнога бюджэту. Ніякай перспектыўнай адносна наступных кварталаў канкрэтыкі няма, і дырэктар “Цэнтра па рэстаўрацыі” Наталля Кузняцова вельмі сумняваецца, што далейшая работа па складанні праектна-каштарыснай дакументацыі сёлета будзе прадоўжана... Карацей, спартыўны прынцып пра “разбег-скачок” не заўжды спрацоўвае на фінансавым полі, дзе любое правіла падпарадкоўваецца найперш крызіснай палітыцы эканомікі.

Даруйце за “бухгалтарскую” цяжкаважкасць першага раздзела, але, пагадзіцеся, без рублёвага падмацавання, без няўхільнага ўліку крэдыторскай ды дэбіторскай запазычанасцей і іншых фінансава-эканамічных нюансаў нічога істотнага ў сферы ўмацавання матэрыяльнай базы культуры не зробіш. Не дадала аптымізму і выснова начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Ігара Чарняўскага: маўляў, хіба ж варта здзіўляцца — у нас руіны Крэўскага ды Навагрудскага замкаў і па сёння свайго часу чакаюць...

Райвыканкамаўскі сайт: пошук інвестараў

Пры запланаваным, “дакрызісным” фінансаванні, як перакананы ў раёне, Палац Булгака ў Жылічах займеў бы новае-старое аблічча ўжо ў 2011 годзе. На выявах архітэктурнага праекта, згодна з якім дэкор палацавых інтэр’ераў і экстэр’ераў будзе ўзнаўляцца з архіўных фотаздымкаў у максімальна набліжаным да гістарычнай праўды выглядзе, усё выглядае досыць велічна і прэзентабельна. У гэтым гістарычным антуражы мяркуецца стварыць дзейсны культурна-дукхоўны цэнтр Жылічаў. Па сутнасці, і сённяшні напаўаварыйны Палац выконвае гэткія ж функцыі. Але ўсе ягоныя складнікі культурнага “змесціва” дзейнічаюць ва ўмовах, далёкіх ад узорных. Школа, якая перабралася з паўночна-заходняй часткі ў галоўны корпус, “арандуе” частку музейных памяшканняў, пакутуе ад недахопу і непрыстасаванасці вучэбных пакояў. Не надта камфортна пачуваюць сябе ва ўмовах “аб’яднання” гістарычны музей і бібліятэка...

У ідэале ДШМ займае сваё сталае месца — паўночна-заходняе крыло, супрацьлеглае галоўнаму корпусу. Пры гэтым школа значна пашырае ўласныя вучэбныя плошчы, бо да рамонту пакоі першага паверха практычна не выкарыстоўваліся.

Музей застанецца на ранейшым месцы, але пры гэтым павялічвае свае экспазіцыйныя магчымасці, набывае статус музея шляхецкай сядзібы XVIII — XIX стагоддзяў, шчыльна супрацоўнічае з дзіцячай школай мастацтваў. Справа ў тым, што мясцовая банкетная зала мае надзвычайныя акустычныя магчымасці. І дырэктар ДШМ Уладзімір Татарынаў спіць і бачыць, каб ладзіць тут не проста канцэрты, але і рэгіянальны фестываль класічнай музыкі. Музыка загучыць і ў добраўпарадкаваным парку, на ўтрыманне якога спатрэбіцца аддзелу культуры і дадатковы штат, і спецыяльная тэхніка. Як, зрэшты, і для догляду за закінутымі цяпер каскаднымі сажалкамі, якія чакаюць свайго часу ледзь не з пасляваенных гадоў.

Палацавы будынак на сёння мае форму літары “П”. У планах — зрабіць сядзібу замкам, аднавіўшы аранжарэйны зімовы сад, канчаткова замкнуўшы перыметр гэтай забудовай. На другім яе паверсе з’явяцца гасцініца і кавярня, якія начальнік аддзела культуры мяркуе ўтрымліваць на ўласным балансе. І гэта далёка не апошнія прыкідкі пашырэння асартыменту платных паслуг.

Новы старшыня Кіраўскага райвыканкама Уладзімір Піскіжаў плануе распачаць вялікую справу з выкарыстаннем усіх наяўных і ўяўных брэндавых магчымасцей вёскі Жылічы. Пры ягоным непасрэдным кіраўніцтве і пры чынным удзеле раённага аддзела культуры на ўездзе ў вёску Боркі ўзнік аб’ект абласнога значэння — мемарыяльны комплекс у памяць аб спаленых фашыстамі жыхарах навакольных паселішчаў. Строгі, жалобны і ўрачысты, ён імгненна стаў самым святым месцам на Кіраўшчыне...

Дык вось, як паведаміў кіраўнік раёна, хвалюе яго не толькі стан палацава-паркавага комплексу. На ўездзе ў Жылічы захаваліся гаспадарчыя пабудовы Булгака, а непадалёк ад самой панскай сядзібы — будынак колішняй карэтні. Іх, натуральна, таксама варта аднавіць і прыстасаваць пад сацыяльна-культурныя аб’екты будучай нагоды. Як паведамляе Уладзімір Уладзіміравіч, на сайце Кіраўскага райвыканкама размешчаны адпаведныя здымкі і звесткі, прызначаныя для прыцягнення інвестараў. Пакуль жадаючых укласці грошы няма. Зразумела, патэнцыйныя інвестары чакаюць, чым завершыцца справа з фінансаваннем рамонту ды рэканструкцыі Палаца, і актывізуюцца, несумненна, толькі пасля ўсведамлення пэўнай грашовай канкрэтыкі.

У кіраўніка Кіраўшчыны ваганняў ды сумневаў у лепшай будучыні і раёна, і рэспублікі няма: фінансаванне, маўляў, узновіцца, аднак час цяпер няпросты. Галоўнае выпрабаванне гэтых дзён — веснавая сяўба, хлебаробская праца на будучы ўраджай, велічыня якога наўпрост паўплывае на заўтрашнюю эканамічную незалежнасць дзяржавы. Словам, будзе хлеб — будзе і культура...

Пагаджаюся: любы кіраўнік павінен мысліць сёння перспектыўна, падзяржаўнаму, і галоўнае тут — вызначыць эканамічныя прыярытэты, не спяшацца, каб агульнараённай справе не нашкодзіць, а калі з’явіцца такая

магчымасць, дык укласці ў адраджэнне Жылічаў максімум, каб гэткі ж максімум — і ў маральным, і ў грашовым эквівалентах — атрымаць потым на выхадзе ад "эксплуатацыі" жыліцкага культурнага комплексу. Пагаджаюся, але працягваю гнуць сваю журналісцкую лінію: вёсцы Жылічы і тамтэйшаму Палацу Булгака патрэбна сацыяльная рэклама. Пра гэтую архітэктурную перліну Магілёўшчыны ведаюць далёка не ўсе, а сярод тых, хто ведае, часам бытуе меркаванне, што цягам рэканструкцыі беззваротна знікне некранутасць ляпніны, якая аздабляе порцікі і столь у пакоях галоўнага корпуса. Мала хто ведае: увесь гэты дэкор быў упершыню рэканструяваны (вельмі якасна і з веданнем справы) яшчэ ў 1970-х. І абнавіць яго можна было б беспраблемна, каб не лядашчасць перакрыццяў і сцен. Так што спачатку ў галоўным корпусе Палаца прыйдзецца заняцца грунтоўным рамонтам, а потым ужо — аднаўленнем ляпных сімвалаў шляхецкай годнасці ў канапнай, гасцінай, банкетнай залах. І зроблена ўсё будзе, як пераконвае Алена Ваяводская — навуковы кіраўнік, архітэктар, адказны за захаванасць гісторыка-культурнай каштоўнасці Жылічаў, па самых сучасных тэхналогіях. Але нават не гэта галоўнае. Палац спаконвек фарміраваў і, неаспрэчна, будзе фарміраваць у вяскоўцаў светапогляднае ўспрыняцце хараства архітэктуры, не абы-як упісанай у непаўторны паркава-азёрны ландшафт. Хараство, урэшце, перамагае тым, што выхоўвае, — непрымусова, спакваля, з года ў год. Ці не тым тлумачыцца надзвычайная колькасць таленавітых дзяцей, што збірае штогод пад сваім дахам мясцовая ДШМ?

Школа мастацтваў у палацавым кантэксце

Але вернемся ад абстрактных задумак, ад прывабных, але пакуль — мрояў, да суровай канкрэтыкі сённяшняга дня.

Закрытае акцыянернае таварыства "Будпраектінвест" вядзе цяпер частковую разборку міжпаверхавых перакрыццяў, драўлянай падлогі, дзвярных блокаў, бетанаванне, узмацненне сцен па перыметры корпуса, дзе з 1972 года дзейнічала ДШМ, і падмуркаў. Галоўны прадстаўнік генпадрадчыка на жыліцкім аб'екце — прараб Валянцін Навойчык. Дарэчы, гэтая брыгада спецыялізуецца, так бы мовіць, на рамонце архітэктурных помнікаў: працавала на аднаўленні Магілёўскага чыгуначнага вакзала, Палаца Пацёмкіна ў Крычаве...

На 10 красавіка брыгада з 17 чалавек асвоіла на будаўніча-мантажных работах каля 80 мільёнаў. Па словах брыгадзіра, да канца месяца сума асваення павялічыцца да 140 мільёнаў. А ўвогуле, пры паўнацэнным і стабільным фінансаванні, як пераконвае Навойчык, асвойваць можна штомесяц па 250 мільёнаў рублёў. Маўляў, на і н ш ы х аб'ектах поруч з "Будпраектінвестам" працавала па восем субпадрадчыкаў... Пажывём — пабачым.

Але дырэктар ДШМ Уладзімір Татарынаў з аптымізмам назірае за будаўніча-мантажнымі работамі: "Мы і ўявіць не маглі, што справа па аднаўленні жыліцкага палаца зрушыцца з мёртвай кропкі!". Дарэчы, мясцовую дзіцячую школу мастацтваў начальнік упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Сінкавец называе ў ліку лепшых навучальных устаноў Магілёўшчыны. Сапраўды, можна шмат гаварыць пра пазабюджэтную дзейнасць ДШМ Кіраўскага раёна (летась на платных паслугах яны зарабілі амаль 48 мільёнаў рублёў, за першы квартал 2009 года — больш за 18 мільёнаў) і пра тое, што мясцовыя юныя таленты становяцца лаўрэатамі прэстыжных фестываляў і конкурсаў... Але гэтая тэма — для іншага артыкула. Хацеў бы цяпер засяродзіць увагу на іншым.

Жыліцкая дзіцячая школа мастацтваў атаясамліваецца ў мясцовых жыхароў — і ў маладзёнаў, і ў людзей сталага веку — з Палацам. "Пайшлі ў Палац!" — значыць: "Пайшлі ў школу!" Гэтыя словы цягам камандзіровачнага дня чуў неаднаразова. А потым і сам на ўласныя вочы пераканаўся: ДШМ у палацавых сценах — пакуль адзіны жывы і яркі "арганізм". Пераканаў мяне ў гэтым не калектыў з 10 педагогаў (ледзь не палова — былыя выхаванцы ДШМ), не цудоўная музыка, што гучыць штодня ў тых пакоях галоўнага корпуса, а хлопчык Віталь Курэпін. Ужо трэцяя па ліку сям'я ўсынаўляе "цяжкага" падлетка ("Ды не паліў я наўмысна тую пуньку, проста з запалкамі па маленстве забаўляўся!"). А "ўтаймавала" Віталя менавіта школа мастацтваў — "Палац". За некалькі гадоў з перарывамі засвоіў ён і нотную грамату, і балалайку. Без пяці хвілін — віртуоз!

Я пра тое, што Палац без школы, а школу без Палаца ў Жылічах не ўяўляюць. З Уладзімірам Татарынавым вітаецца ўся вёска. Цягкучкі кадраў ва ўстанове — аніякай. З 285 юнакоў і дзяўчат, выпушчаных за гады дзейнасці ДШМ, 79 звязалі лёс з музыкай і выяўленчым мастацтвам. Школа, як дрэва кіслародам, насычае наваколле дабрынёй і хараством.

Адна з галоўных праблем, што псуе Татарынаву настрой, — "гульня на чужым полі". І музею мастакі з музыкамі перашкаджаюць, і самі як след на абмежаваных ды непрыстасаваных плошчах разгарнуцца не могуць. Таму і наведваецца штодня Уладзімір Татарынаў на будоўлю, сочыць, як ягоная колішняя школа пакрысе аднаўляецца. Пасля завяршэння ўсіх работ у гэтым "школьным" крыле рабочая плошча значна павялічыцца, бо пад ДШМ адыдзе ўвесь першы паверх, які раней амаль не выкарыстоўваўся. "Гэта ж якія магчымасці з'явяцца ў сотні нашых навучэнцаў! — у чарговы раз прыкідвае творчыя перспектывы кіраўнік установы. — А тады і пра "палацава-паркавы фестываль" гаворку можна весці".

Фестываль як іміджавы стымул развіцця Жыліцкага палацава-паркавага комплексу і аўтаматычна — будучага духоўна-культурнага цэнтра, як прынада для турыста і як узнагарода для мясцовых юных талентаў — рэч цудоўная. Але, сцвярджае прагны да дзівосных пераўтварэнняў Татарынаў, пра такую імпрэзу і далейшую выніковую дзейнасць ДШМ і марыць не варта, калі не замяніць "парк" музычных інструментаў. А вось гэтая праблема, без сумневу, цудоўна вядомая любой навучальнай установе культуры — хоць сталічнай, хоць рэгіянальнай. І на апошняй калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь пытанне зношанасці музычных інструментаў абмяркоўвалася вельмі сур'ёзна. Адзінае выйсце, калі няма адпаведнай айчыннай вытворчасці, калі актуальнай застаецца мінімізацыя фінансавання, — звярнуцца па дапамогу да Урада. Бо не толькі ў Жылічах патрэбны якасныя баяны кшталту "Юпіцера", домры, балалайкі... Праўда, ёсць шыкоўны японскі раяль, набыты за абласны кошт, але ставіць яго пакуль няма куды...

І калі па-новаму загучыць Палац, калі непарыўнымі звёнамі ў гэтым культурна-духоўным ланцугу стануць школа мастацтваў, музей, гатэль, кавярня, аранжарэя і парк, — вёска Жылічы набудзе новы статус.

Хто ў вёсцы гаспадар?

І, бадай, апошняе. Больш за 15 гектараў Жыліцкага парку належыць РУП "Жылічы", больш за 1, 7 — агранамічнаму каледжу, 0,8 гектара — аддзелу культуры Кіраўскага райвыканкама. Як кажа кіраўнік рэгіёна Уладзімір Піскіжаў, у вёсцы, напэўна, прадстаўлены ўсе магчымыя формы ўласнасці. Пахадзіўшы па вуліцах вельмі заможнай за савецкім часам вёскі, даведаўся, што непадалёк дзейнічае вельмі неблагая і адносна танная сталоўка. Але поруч вельмі неўрачыста, у параўнанні з адмысловым палацава-паркавым комплексам, месціцца двухпавярховая будыніна з павыбіванымі шыбамі — закінуты сямейны інтэрнат. А крыху далей — Дом культуры, які знаходзіцца на балансе агранамічнага каледжа, але практычна бяздзейнічае і, наколькі даведаўся, адпаведнага штата культасветнікаў не мае, бо ў новым будынку сельскагаспадарчай навучальнай установы ёсць шыкоўная глядзельная зала, дзе і ладзяцца сумесныя з дзіцячай школай мастацтваў канцэрты.

Словам, хоць і сталі Жылічы адносна нядаўна аграгарадком, але, на вялікі жаль, адзінага ды дбайнага гаспадара ў вёсцы, будзем шчырымі, пакуль не бачна. Інфраструктура будучай турыстычнай цікавосткі Магілёўшчыны існуе толькі ў папярэдніх прыкідках старшыні Кіраўскага райвыканкама Уладзіміра Піскіжава (узгадайце райвыканкамаўскія сайты, скіраваныя на пошук інвестараў вясковага добраўпарадкавання) і ў марах начальніка мясцовага аддзела культуры Тамары Галубоўскай. Са свайго боку, дадам толькі адзінае: адной з вядучых каардынацыйных сіл па духоўным і культурным адраджэнні і далейшым развіцці вёскі Жылічы бачыцца менавіта раённы аддзел культуры. Хаця б з тае нагоды, што мае ў сваім падпарадкаванні не абы-які брэнд — Жыліцкі палац...

***

І напрыканцы — зноў некалькі лічбаў грашовых сум, ад якіх наўпрост залежыць далейшы лёс палацава-паркавага ансамбля. Згодна з сёлетнім планам фінансавага забеспячэння рэканструкцыі з рэстаўрацыяй і прыстасаваннем, у другім квартале мяркуецца выкарыстаць (і з рэспубліканскага, і з абласнога бюджэтаў) крыху больш за 400 мільёнаў, у трэцім — 490, у чацвёртым — мільярд рублёў. Хіба ж дзіва, што гэтыя сумы для мясцовых культасветнікаў сталі знакавымі і лёсавызначальнымі? Ці ж можна іх падмануць у чаканнях?! І нездарма два гады таму артыкул "К" пра мясцовыя праблемы быў названы "Жыліцкі палац як рухавік перамен". Не будзе Палаца — не будзе і жыліцкай перспектывы. Таму і сённяшні артыкул хацелася б завяршыць, як і артыкул пазалеташні: "Пра этапы адраджэння палацава-паркавага ансамбля ў Жылічах мы будзем паведамляць на старонках "Культуры".

Яўген РАГІН,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Жылічы — Мінск
Фота аўтара

1.Галоўны фасад Жыліцкага палаца; 2. Від на "музейную" вежу галоўнага корпуса; 3. Рамантуецца "школьны" палацавы корпус; 4. На гэтых старадаўніх металічных бэльках стаіць кляймо "Дзямідаў"; 5. Каця Дарафеева ў Жыліцкай ДШМ асвойвае гітару; 6. У левай частцы гэтага крыла месцілася да рамонту школа мастацтваў; 7. Галоўны корпус Палаца фрагментарна знаходзіцца ў аварыйным стане; 8. Праз гэтую палацавую арку можна выйсці ў парк; 9. Умацоўваецца перыметр палацавага будынка; 10. Шыльда на галоўным корпусе; 11. Працуе "Будпраектінвест"; 12. Банкетная зала Жыліцкага палаца, дзе і мяркуецца ладзіць музычныя фестывалі.



З Паслання Прэзідэнта краіны беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу

"Больш энергічным павінна стаць развіццё сферы паслуг у малых і сярэдніх гарадах.

У гэтай сувязі вельмі актуальнай з'яўляецца тэма развіцця культурнага турызму. Сёння ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей налічваецца амаль пяць тысяч помнікаў, размешчаных якраз-такі ў невялікіх населеных пунктах. Але што зроблена для таго, каб выкарыстоўваць гэтае багацце? Хваліцца, шчыра скажам, няма чым: мала гасцініц, няма кемпінгаў, утульных прыдарожных кафэ.

Не ўмеем зарабляць на турызме грошы, а часам нават лянуемся падняць іх з зямлі. Не абавязкова захапляцца мегапраектамі накшталт татальнага ўладкавання Аўгустоўскага канала, хоць і гэта трэба рабіць. А хіба гістарычныя палацы, сядзібы, малабюджэтны сельскі турызм не вартыя таго, каб неадкладна заняцца імі? Нарач, Сож, Днепр, Браслаўскія азёры, Белавежская і Налібоцкая пушчы — хіба гэта прыродная прыгажосць не прывабіць турыста? Калі не хапае грошай у бюджэту і па-ранейшаму неразворотлівыя нашы ведамствы, — пусціце прыватны бізнес, развяжыце яму рукі. Мяркую, тут не трэба нейкіх асаблівых дырэктыў з Мінска. Усё могуць зрабіць і павінны зрабіць абласныя і раённыя ўлады".

“Часцей частуй”, “Кругліца”!

Разхадовы — ад прашчураў да зор

Такога, шчыра кажучы, яшчэ не бачыў... На сцэне Кругліцкага сельскага дома культуры, што на Чашніччыне, жанчыны ў нацыянальных строях з цапамі і віламі-варушылкамі паказваюць пасярод жытнёвых снапоў абрад “Дажынкі”. Ды яшчэ і спяваюць пры гэтым акапэльна. Цапы — свісцяць-пырхаюць, кабеты — знітоўваюць рытм працы з неўтаймоўным песенным суладдзем. Ёсць яшчэ ў іхнім рэпертуары Ільняная талака, абрады Зажынак, Вялікадня... Мяркуецца, што фальклорны гурт “Кругліца” прыме самы актыўны ўдзел у творчай справаздачы Віцебшчыны, што пройдзе неўзабаве ў Палацы Рэспублікі...

Салісткі фальклорнага гурта “Кругліца” з Чашніцкага раёна.

Больш за ўсіх ведае песень 79-гадовая спявачка Аляксандра Шыбека.

А пачалося ўсё з Аляксандры Іосіфаўны Шыбека. Самая дасведчаная не толькі ў працы — усё жыццё ў палаводстве і ў народнай песні. Такім чынам у 1976 годзе і быў створаны фальклорны калектыў “Кругліца”, кіраўніком якога стала дырэктар мясцовага СДК Валянціна Жылінская. З таго часу дзейнасць сельскай установы культуры абапіраецца ў першую чаргу на фальклорныя масавыя мерапрыемствы. У складзе гурта — 12 кабет: бібліятэкар Валянціна Бурэц, мастацкі кіраўнік Дома культуры Вольга Конанава, клубная тэхнічка Наталля Дубінец, галоўны бухгалтар мясцовай сельскай гаспадаркі Ніна Папкова і многія іншыя вясковыя пявунні.

Што ўваходзіць у першачарговыя задачы гурта? Пошук мясцовых песень. Пабывала “Кругліца” ў навакольных вёсках Вялікія Труханавічы, Хотліна, Грыбіна. Запісалі сямейна-бытавыя песні “Пагода была ціхая”, “Часцей частуй”, “Месяц цёмны”, “Балота, асіна”, “Наша красачка”. А Кацярына Кухта і Наталля Барадаўка дапамаглі з узнаўленнем старадаўніх абрадаў “Вялікдзень”, “Зажынкі”... Яшчэ адна мэта “Кругліцы” — адраджэнне і захаванне мясцовай танцавальнай творчасці. У рэпертуары гурта на сёння — такія унікальныя рэгіянальныя танцы, як “Разхадовы”, “Яблычак”, “Лысы”, “Кракавяк”...

Летась фальклорны гурт стаў народным. “Кругліца” — лаўрэат абласнога агляду-конкурсу фальклорнага мастацтва “Ад прашчураў да зор” у межах Рэспубліканскага фестывалю “Берагіня”, удзельнік абласнога конкурсу выканаўцаў беларускай песні “На святой зямлі Сафіі” ў Полацку.

Я.Р.
Фота аўтара

“Вы малявалі каля маёй Волі?”

У Івацэвіцкім гарадскім доме культуры працуе выстаўка самадзейнага мастака Аляксандра Пукалы “Заздароўны гімн прыродзе”. Гэта трэцяя па ліку персанальная выстаўка творцы. Даўняя прыхільніца таленту мастака, ініцыятар выстаўкі і дырэктар установы Тамара Воўк упэўнена: у гэтых пейзажах ёсць настрой, які імгненна перадаецца спагадлівай душы. “Творца не проста малюе, — гаворыць Тамара Яўгенаўна, — а з любоўю апявае хараство навакольнай прыроды”.

А.Пукала. “Дуброва”.

А.Пукала. “Край мой родны”.

Аляксандр Мікалаевіч — разнастайны ў захапленнях: ён і рыбак, і пчаляр, і грыбнік, а ўвогуле — добразычлівы і светлы чалавек.

— Колькі блізкага і роднага ў пейзажах мастака! — з захапленнем гаворыць аб творчасці Аляксандра Мікалаевіча начальнік раённага аддзела культуры Любоў Фосцікава. — У іх кожны знаходзіць той куточак, дзе нарадзіўся. Згадваю, як на адкрыцці выстаўкі то адзін, то другі наведвальнік пытаў мастака: гэта вы малявалі каля маёй Волі, а гэта — у Падстарыні? А я, гледзячы на стагі сена, адразу ўзгадала свае родныя Яглевічы, як мы з дзедам па такой жа палявой дарозе, што на карціне, ішлі на сенажаць...

Персанальная выстаўка Аляксандра Пукалы ў гарадскім Доме культуры — трэцяя па ліку. Сцэнарый сёлетняга вернісажу рыхтавалі дырэктар гісторыка-краязнаўчага музея Раіса Горбач са сваімі супрацоўнікамі Галінай Дылюк і Кацярынай Былінскай.

Алена КАПАЧОВА
Івацэвічы

Арт — “Артыс” — артысты

Два кубкі, дыпломы лаўрэатаў і дыпламантаў прывезлі ўдзельнікі эстраднай студыі “Артыс-шоу” Рэчыцкай дзяржаўнай школы мастацтваў з IX Міжнароднага фестывалю-конкурсу “Будучае планеты”, які нядаўна прайшоў у Санкт-Пецярбургу.

Як паведаміў кіраўнік эстраднай студыі “Артыс-шоу” Яўген Бірыла, гонар Беларусі на гэтым мерапрыемстве адстойвалі толькі рэчыцкія артысты. Прычым у конкурсе ўдзельнічала больш за 700 прадстаўнікоў краін блізкага і далёкага замежжа.

Яўген Аляксандравіч задаволены выступленнем сваіх выхаванцаў, тым больш, што эстрадная студыя арганізавалася толькі ў 2006 годзе, а першы сольны канцэрт дала ў 2008-м у мясцовым ДК.

Гэта — першая паездка студыі на міжнародны конкурс. Увесь калектыў быў узнагароджаны кубкам і дыпломам лаўрэата трэцяй ступені. Такога ж выніку дабіўся саліст Ян Разуменка з песняй “Вышэй”. Дыпламантам другой або трэцяй ступені конкурсу стаў кожны ўдзельнік студыі.

У планах творчага калектыву — выступленне на міжнародным конкурсе “Залатая пчолка” ў Клімавічах, удзел у гарадскіх мерапрыемствах, прысвечаных 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, паездка ў Севастопаль на Міжнародны конкурс дзіцячай творчасці. Восенню “Артыс-шоу” плануе прадставіць другую праграму.

Юрась ГАРЧАК

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, поруч з творчасцю і прыгажосцю, ніколі не забываўся на сваіх выкладчыкаў-ветэранаў.

Веснавы канцэрт

Рэктарат на чале з Барысам Святловым, прафсаюз і ветэранская арганізацыя ўстановы запрасілі колішніх супрацоўнікаў-пенсіянераў на веснавы канцэрт, дзе выступілі і студэнты, і выкладчыкі. Рэктар запэўніў: “Мы хочам, каб вы не адчувалі сябе адзінокімі, нам патрэбны вашы веды і вопыт”.

Ветэраны ВАВ Л.Б. Міронава, М.М. Барысава, В.С. Ганчарова, Т.Т. Латоціна і іншыя не толькі сказалі колькі слоў са сцэны, але і цудоўна спелі. Узнікла таксама ідэя стварэння ветэранскага хору пры БДУКіМ.

Галіна МАХАЕВА,
пенсіянер-ветэран БДУКіМ

Адкрыццё ў аграгарадках Магілёўшчыны філарманічных пляцовак значна пашырыла канцэртна-гастрольную дзейнасць абласной філармоніі па абслугоўванні сельскіх жыхароў.

Філармонія ў аграгарадках

Натуральна, і раней творчыя калектывы ды выканаўцы выязджалі ў вёскі. Напрыклад, праграма “Майстры мастацтваў — працаўнікам вёскі” — адна з запатрабаваных. Але цяпер, калі ў глыбінцы пачалі дзейнічаць канцэртныя пляцоўкі, абсталяваныя сучаснай гукаўзмацняльнай апаратурай, прафесійным выканаўцам стала прасцей даносіць да гледачоў сваю творчасць.

План мінулага года ў параўнанні з пазалеташнім выкананы на 164,5 працэнта. Вяскоўцы добра ведаюць усе філарманічныя калектывы, любяць іх і чакаюць. З новай праграмай, прысвечанай Году роднай зямлі, пабываў у аграгарадках “Дашкоўка” і “Вейна” Магілёўскага раёна камерна-інструментальны ансамбль “Барыня” — старэйшы філарманічны калектыў. Праграма знаёміць з нашымі народнымі інструментамі, музычнымі творамі беларускіх класікаў. Гэта і лекторый, і канцэрт з агульнай назвай “Мелодыі роднай зямлі”.

Людміла МАЦКЕЛА
Магілёў

Выстаўка з аптымістычнай назвай “Я люблю цябе, жыццё!” прайшла ў Гродзенскай выставачнай зале.

Драўляны сыр — смачны

У своеасаблівай справаздачы творчых набыткаў народнага мастацкага аб’яднання майстроў народнай творчасці “Гарадзенскі каларыт” былі прадстаўлены розныя работы, выкананыя ў такіх накірунках народных рамёстваў, як саломкапляценне, лозапляценне, вышыўка, кераміка, графіка, кавальства... Упершыню экспанаваўся рэдкі від народнай творчасці — роспіс па шкле.

А самай вялікай папулярнасцю ў наведвальнікаў карысталася выразаная з дрэва скульптура адвечных спадарожнікаў чалавека — коткі і мышаняці — пад назвай “За сырам”.

Аляксандра ДУБРАВІНА
Гродна

Сёлета ў Ляхавіцкім раёне, у вёсцы Навасёлкі, па ініцыятыве мясцовай настаўніцы Алены Хмарук створаны Музей лёну.

Чаго не любіць лянок?

Шматлікія экспанаты музея расказваюць, якімі спосабамі апрацоўвалі сыравіну нашы бабулі і дзядулі. Тут прадстаўлены церніцы, прасніцы, верацёны, ткацкія станкі. Ёсць і льняныя вырабы: посцілкі, ручнікі...

Асобнае месца ў музеі займаюць матэрыялы аб сучаснай машыннай тэхналогіі апрацоўкі лёну і атрыманні высакаякаснай прадукцыі. За кароткі прамежак часу музей наведала больш за тысячу чалавек. Варта адзначыць, што музей вабіць не толькі дзяцей, але і людзей сталага ўзросту, якім таксама цікава паглядзець на экспанаты, успомніць сваю маладосць.

Фёдар ЛАПАНІК
Ляхавічы

У Музеі беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах адкрылася новая выстаўка — “Зямное прыцяжэнне”, дзе прадстаўлены касцюмы, выкананыя з прыродных і другасных матэрыялаў.

Плінтус, апорт!

Дзякуючы творчаму саюзу двух таленавітых людзей — Марыны Леўшынай і Вольгі Музычэнка — яшчэ ў 2003 годзе была створана арт-студыя “Былі-небыліцы”, што аб’ядноўвае два гурткі: “Экамода” — для старшакласнікаў — і падрыхтоўчы “Эка-арт” — для самых маленькіх дзетак.

Цяжка паверыць, што такая прыгажосць створана рукамі дзяцей. Цікава і тое, што яны самі пішуць сцэнарыі да сваіх спектакляў і тэатралізаваных дзей. Касцюмы і лялькі ствараюцца з тых жа другасных матэрыялаў. Вельмі падабаюцца дзецям смешныя лялькі — сабака Плінтус і котка Фурнітура, а таксама тэатральныя лялькі да казак “Як кот звяроў здзівіў”, “Марозка” і “Каза-дзераза”.

Выстаўка будзе працаваць да канца вясны.

Таццяна АНДРЫЕВІЧ,
навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь
Раўбічы

Знайсці адказ за 60 секунд

У палітры забаўляльных шоу і перадач на айчынных тэлеканалах нарэшце з'явіўся і аналаг любімага многімі элітарнага інтэлектуальнага клуба "Што? Дзе? Калі?". Уладальнікам першай Крыштальнай савы ў прэм'ернай серыі беларускага тэлеклуба стаў Раман АЛЬШЭЎСКІ. У мінулым супрацоўнік нашай газеты, сёння ён на старонках "К" у іншай іпастасі.

Фота Юрыя ІВАНОВА

Крыштальная сава "прыляцела" да былога журналіста-"культураўца"

Адказваць — больш упэўнена!

— Раман, як табе — удзельніку праграмы — спадабалася тое, што ты ўбачыў у выніку на тэлеэкране?

— Сапраўды, паглядзець на тое, як усё гэта выглядала збоку, было цікава: паназіраць, як усё спрацуе, што атрымаецца пасля мантажу. Павінен сказаць, для выхаду беларускай тэлевізійнай версіі "Што? Дзе? Калі?" наша АНТ зрабіла такую сур'ёзную падрыхтоўчую работу, якая, да прыкладу, на Украінскім і Азербайджанскім тэлебачанні доўжылася прыкладна паўтара года. Надзвычай складаная праца аператара: "лавіць" дзею з трох пунктаў і сачыць за ўсімі нюансамі гульні. І, безумоўна, было цікава паглядзець збоку не толькі на саму "карцінку", але і на сябе: адсачыць паводзіны, міміку. Кожны раз грымёры прыдумлялі мне нейкую новую прычоску, і ўжо на стадыі накладання грыму ўзнікала цікаўнасць: як гэта будзе выглядаць на тэлеэкране? Убачыў, што я крыху нервуюся і ў мяне вельмі экспрэсіўная міміка, тым не менш, выказваюся ясна і шмат усміхаюся.

— А нейкія крытычныя высновы для сябе зрабіў?

— Трэба меней хвалявацца, вучыцца трымаць сябе перад тэлекамерай, паводзіць сябе і адказваць на пытанні больш упэўнена. Хаця гэта было вельмі складана: калі мы выходзілі да камер, не толькі мяне, маладога ў камандзе, але і больш вопытных ігракоў літаральна трэсла.

Калі выкладваешся па максімуме

— Напэўна, хваляванне — гэта натуральны стан іграка, і ўзнікае яно не толькі перад тэлекамерамі?

— Некаторы элемент хвалявання, канешне ж, ёсць, але ж калі ты іграеш у "Што? Дзе? Калі?" цягам дзесяці гадоў, цябе ўжо складана чымсьці здзівіць. Ёсць, канешне, свая спецыфіка ў элітарнага клуба "Што? Дзе? Калі?". У спартыўных турнірах ты, да прыкладу, адказваеш на 600 пытанняў, бываюць яшчэ і турніры-марафоны — там ты іграеш 36 гадзін запар. І там зусім іншыя адчуванні: ведаеш, што калі дзесятку пытанняў прапусціў — далей можна нагнаць. А тут адзін неадказ — і ўжо нехта іншы замест цябе выйдзе ў лідэры. Таму на кожным пытанні выкладваешся па максімуме.

— Усе мы ў рознай ступені бываем "знатакамі", калі, лежачы на канапе, "хварэем" за футбол, хакей, а нярэдка нават і тэлевізійных знатакоў абыгрываем, даючы адказы хутчэй за іх...

— Так, канапны знаток — гэта асаблівы тып, які заўсёды і ва ўсё іграе лепш! Нават калі ў зале стаіш, раз-пораз думаеш: пытанні ж, у прынцыпе, не складаныя... А варта пачаць самім іграць…

— У чым жа справа?

— Калі ты не за сталом, то, як правіла, меней напружаны.

— Дарэчы, акрамя моцных нерваў, што павінна быць у знатака на першым месцы: веды, сабранасць, хуткасць мыслення?..

— Безумоўна, аснова ўсяго — веды і эрудзіраванасць. Знаток — ад слова "знать". Калі ты чагосьці не ведаеш — чытай! Андрэй Духоўнікаў, адзін з маіх першых трэнераў, так і казаў: "Хлопцы, замест таго, каб у "Што? Дзе? Калі?" іграць, кніжкі б разумныя чыталі". Таму, канешне, ведаць патрэбна шмат.

Другі, не менш важны, навык — уменне лагічна разважаць. Ёсць тэрмін "знаток", а ёсць — "інтэлектуал", які мне нават падабаецца больш. Напачатку ты яшчэ не ведаеш адказу на пытанне, а часам проста і не можаш яго ведаць, але праз хвіліну ў выніку лагічных разважанняў яго знаходзіш. І канешне ж, значную ролю адыгрывае асацыятыўнае мысленне — калі ты, да прыкладу, па асацыяцыі здольны зразумець, як, дапусцім, чукчы называюць ручны гадзіннік.

Сава — кілаграмы два

— Колькі важыць твая Крыштальная сава?

— Кілаграмы два. Спецыяльна не ўзважваў, але ўсе, хто бралі яе ў рукі, адчулі "вагу".

— Дзе яна будзе займаць месца?

— Вось усе пра гэта пытаюцца! Зраблю для яе спецыяльны алтар, пастаўлю партрэт Мухіна… *(Смяецца.)* Ды не, будзе сабе стаяць на паліцы, на ганаровым месцы.

— Значыцца, ахвяр ёй прыносіць не будзеш?

— Чалавечых — не!

— Давай вернемся да ведаў: які "аб'ём" кніг ты прачытваеш зараз?

— Цяпер, на жаль, чытаю меней, чым калі быў школьнікам, студэнтам: шмат часу займае праца, прафесійная літаратура. Гэта, канешне, вельмі крыўдна, што інтэнсіўнасць чытання кніг памяншаецца. З іншага боку, многае чэрпаю для сябе ў Інтэрнеце, з задавальненнем "гартаю" "Вікіпедыю".

— А як жа наконт таго, што Інтэрнет — гэта, так бы мовіць, не аўтарытэтная крыніца: там пішуць людзі без "ступеняў", і факты гэтыя ніхто не пераправярае і не рэдагуе?

— На самой справе, тая ж "Вікіпедыя" вельмі няслаба правяраецца якраз людзьмі з навуковымі ступенямі, якім гэта проста цікава. Яны — прыхільнікі той ці іншай тэмы, а такія людзі, як правіла, ведаюць нейкія рэчы лепей, чым мэтры, спецыялісты. Гэта цікава, і свайму інтарэсу яны аддаюць усіх сябе. Бо ў "Што? Дзе? Калі?" пытанні будуюцца зусім не на канкрэтных ведах канкрэтных фактаў.

Фармат інтарэсу

— Не так і рэдка даводзіцца чуць папрокі на адрас нашага тэлебачання: маўляў, яно вельмі шмат закупляе заметных перадач, ток-шоу, гульняў, замест таго, каб прыдумаць штосьці сваё, арыгінальнае. Як думаеш, гэта слушна ў дачыненні да беларускага "Што? Дзе? Калі?"?

— А калі рэжысёр бярэцца паставіць спектакль — яму лепей напісаць сваю ўласную п'есу ці звярнуцца да добрай, праверанай часам драматургіі? Альбо, у што б пагуляць: у футбол, ці прыдумаць уласную гульню з нейкай квадратнай штукай, якую мы будзем кідаць рукамі пэўным спосабам?..

Я думаю, што гэты тэлевізійны праект аказаўся, безумоўна, цікавым. Тым больш, "Што? Дзе? Калі?" — гульня міжнародная, у яе насамрэч іграюць паўсюдна. На Беларусі велізарны рух — Беларуская ліга інтэлектуальных каманд — адно з самых вялікіх нашых грамадскіх аб'яднанняў. Адпаведна, і інтарэс да гэтай гульні вельмі вялікі.

— Можаш хаця б прыблізна акрэсліць, колькі беларусаў іграюць у "Што? Дзе? Калі?"?

— У дарослай лізе — прыкладна паўтары тысячы чалавек, і проста велізарны дзіцячы рух. У нас на вельмі добрую аснову пастаўлена работа з дзецьмі: літаральна ў кожным рэгіёне на ўзроўні палацаў дзяцей і моладзі іграюць у "Што? Дзе? Калі?", праводзяцца рэгіянальныя турніры, абласныя, рэспубліканскія, міжнародныя, Гомель нават прымаў чэмпіянат Еўропы сярод школьнікаў. А потым дзеці вырастаюць і працягваюць іграць, узмацняючы ўжо дарослую лігу. Дарэчы, у Мінску, наколькі я ведаю, — самы вялікі па колькасці каманд клуб "Што? Дзе? Калі?" у свеце!

— Ёсць такая прыказка: "Рыбак рыбака бачыць здалёк". Ці можаш ты абмаляваць характэрныя рысы іграка ў "Што? Дзе? Калі?"?

— Ён разумны, вясёлы, шмат ведае і любіць дзяліцца сваімі ведамі з іншымі. На самой справе, як людзі — усе розныя, такія ж розныя і ігракі ў "Што? Дзе? Калі?". Ёсць сярод іх сапраўдныя "хадзячыя энцыклапедыі" — як, напрыклад, Анатоль Васэрман. А ёсць проста вясёлыя і завадныя людзі. Не трэба забывацца: "Што? Дзе? Калі?" — маладзёжны рух, у ім у большасці сваёй гуляюць студэнты, у якіх, відаць, найбольш вольнага часу. Пазней ужо камусьці праца не дазваляе, камусьці — сям'я, дзеці…

І пра "брэндавыя" фігуры

— Але ж "брэндавыя" фігуры "Што? Дзе? Калі?" зусім не маладыя.

— Наш Алесь Мухін — ён малады ці не?.. У параўнанні з Масквой — так, малады. Але ж, да прыкладу, на Украінскім тэлебачанні ў "Што? Дзе? Калі?" яшчэ больш маладое пакаленне, чым наша.

— Вось ты кажаш: на Беларусі магутны рух і моцныя ігракі. Але мы, у асноўным, ведаем расійскіх...

— Па расійскіх адразу запытаюся: ведаеш, хто такі Антон Губанаў?

— ...

— А між тым, каманда Антона Губанава — неаднаразовы чэмпіён свету па "Што? Дзе? Калі?" і ўзначальвае рэйтынг МАК ужо дастаткова доўгі час. Проста, ён не "іграе ў тэлевізар".

З іншага боку, мы якраз і спадзяёмся, што гэтая тэлевізійная серыя "Што? Дзе? Калі?" прыцягне ўвагу да саміх гульняў.

— У супрацьвагу "тэлевізійным" расійскім Анатолю Васэрману і Барысу Бурдзе, назаві хаця б аднаго з беларускіх ігракоў, каго ты лічыш моцным, цікавым...

— Улад Дронаў, які іграе са мной у адной камандзе, — некалі ў "Своей игре" ён "выбіў" з яе самога Барыса Бурду. Мы нават жартавалі, што менавіта таму той і не назваў яго цяпер лепшым іграком першай серыі. Хаця, канешне ж, Барыс Аскаравіч вышэй гэтага. Ён, дарэчы, вельмі мілы і прыемны чалавек. У адным з інтэрв'ю ў яго спыталіся: "Ці не здаецца вам, што разумных не любяць?" А ён адказаў: "Ведаеце, не любяць нудных і сумных, а разумныя і вясёлыя заўсёды былі "каралямі". Я, — кажа ён, — быў невысокі і не з прыгажуноў, але разумны і вясёлы, дзякуючы чаму быў "шэрым кардыналам" свайго двара".

— А ты ў двары кім быў?

— А я якраз дома сядзеў і кніжкі чытаў...

— Як ты бачыш сябе далей у гульні?

— Ды, па сутнасці, нічога не змянілася. Атрыманне мной Савы — у значнай ступені выпадковасць: як выйгрыш у казіно, які атрымліваецца дзякуючы азарту, рызыцы і пэўнай ступені ўдачы. Пашанцавала: выпалі "нашы" пытанні, дзякуючы якім мы і сыгралі 6:2, іншым жа камандам выпалі "не іх" пытанні… Хто ведае, што б было, калі б усё склалася інакш?..

Гутарыла Таццяна КОМАНАВА

P.S. *"Дарэчы, — згадаў напрыканцы нашай гутаркі Раман, — карыстаючыся выпадкам, віншую з надыходзячым Днём друку ўсіх сваіх калег-журналістаў, і асабліва — "Культуры". Плёну вам і вострага пяра!"*

Т.К.

У галерэі "Ракурс" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі працуе мастацкая выстаўка "Шляхамі Тараса Шаўчэнкі".

Ракурс на Шаўчэнку

Сёлета сусветная грамадскасць адзначае 195-годдзе з дня нараджэння выдатнага ўкраінскага паэта і мастака Тараса Рыгоравіча Шаўчэнкі, жыццё і творчасць якога цесна звязаны і з Беларуссю.

Пасольства Украіны ў Рэспубліцы Беларусь сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі арганізавалі гэтую экспазіцыю, якая адбылася па выніках работы пастаяннай творчай экспедыцыі мастакоў львоўскага Палаца мастацтваў. Па тэрыторыі Украіны мастакі адолелі 9 тыс. км, наведалі Літву, Казахстан, Расію, у чэрвені мінулага года ўдзельнікі экспедыцыі пабывалі на Беларусі. Пад час гэтага творчага падарожжа было створана звыш 1000 палотнаў.

У падарожжы па мясцінах, дзе давялося бываць Шаўчэнку, прынялі ўдзел 26 мастакоў, сярод якіх — як маладыя творцы, так і прызнаныя майстры: Зяновій Кецала, Уладзімір Пацік, Яўген Манішын, Арэст Скоб і іншыя вядомыя мастакі.

На выстаўцы прадстаўлены жывапісныя работы, фотаздымкі, а таксама філатэлістычныя стэнды, прысвечаныя Тарасу Шаўчэнку. У галерэі "Ракурс" таксама разгорнута кніжная экспазіцыя, якая прэзентуе дакументы з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, прысвечаныя Шаўчэнку як мастаку і паэту.

Ул. інф.

Як паведаміў "К" дырэктар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы Алег Хмялькоў, 28 — 31 мая ў Клімавічах пройдзе чарговы Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці "Залатая пчолка".

Цуды "Залатой пчолкі"

У дзевятым па ліку мерапрыемстве прымуць удзел юныя таленты з Беларусі, Расіі, Украіны, Балгарыі, Польшчы, Малдовы, чакаюцца госці з Харватыі. Заснавальнікі "Залатой пчолкі" — Магілёўскі аблвыканкам і Клімавіцкі райвыканкам.

Гарадскі парк прапануе 29 мая "Вечар цудаў". Тут збяруцца ўдзельнікі фестывалю, юныя зоркі айчыннай эстрады. Вечар пройдзе пад дэвізам "Цуды вакол нас, цуды — гэта мы". А завершыцца прадстаўленне вогненным шоу.

Па традыцыі, фестывальны конкурс вызначыць пераможцаў у чатырох намінацыях — "Народныя і эстрадныя спевы", "Народна-сцэнічны і эстрадны танец", "Выяўленчае мастацтва" і "Дэкаратыўна-прыкладная творчасць", — па дзвюх узроставых групах: 9 — 12 і 13 — 16 гадоў. Пройдуць конкурсы малюнкаў, салодкіх кулінарных вырабаў. Будзе ладзіцца канцэрт "Святочны калейдаскоп". У планах — рэалізацыя культурна-аздараўленчага праекта "Свет мёду і здароўя".

А завершыцца "Залатая пчолка" святочным шэсцем удзельнікаў і гала-канцэртам.

Наш кар.

Вядучы рубрыкі — Канстанцін АНТАНОВІЧ

За дзвярыма "Стальнога пакоя": беларуская Талстаўіяна

Як "К" паведамляла ўжо, у межах Года культуры Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь пачалася рэалізацыя сумеснага выставачнага і культурна-адукацыйнага праекта Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры з Дзяржаўным музеем Л.М. Талстога, які ўваходзіць у "Спіс асабліва каштоўных аб'ектаў культурнай спадчыны народаў Расійскай Федэрацыі". У маскоўскім музеі захоўваецца унікальны архіў класіка рускай літаратуры, графа Льва Талстога. А самае каштоўнае з гэтага архіва знаходзіцца ў незвычайным сховішчы — у спецыяльна абсталяваным "Стальным пакоі".

Ні ў адным музеі ці бібліятэцы Расіі і за яе межамі няма арыгінальных аўтографаў Льва Талстога і адрасаваных яму рукапісаў, акрамя як у "Стальным пакоі" ў Маскве. Гэтым тлумачацца адмоўныя адказы, атрыманыя беларускімі даследчыкамі на іх запыты ў Ясную Паляну, дзе жыў пісьменнік і куды прыходзілі да яго лісты з Беларусі. Менавіта ў названым сховішчы ёсць матэрыялы з Беларусі. Сярод іх — больш за 100 аўтографаў, што ў асноўным датуюцца другой паловай 1880-х — 1910 гадамі.

Фрагмент экспазіцыі выстаўкі.

Папулярнасць Льва Талстога яшчэ пры яго жыцці на Беларусі была вялікай: неаднаразова праходзілі чытанні твораў, лекцыі пра пісьменніка, ставіліся п'есы. На пачатку XX стагоддзя ў Бабруйску, Віцебску, Гомелі і Мінску адбыліся інсцэніроўкі твораў "Власть тьмы", "Живой труп", "Воскресенье", "Анна Каренина", "Крейцерова соната".

Нават людзі непісьменныя, як казаў Цішка Гартны, ведалі імя Льва Талстога. Сяляне, настаўнікі, гімназісты звярталіся з лістамі да расійскага пісьменніка з самымі рознымі мэтамі: знайсці адказ на пытанні па грамадскіх, жыццёвых, духоўных праблемах, набыць кнігі, папрасіць матэрыяльную дапамогу на вучобу ці іншую патрэбу, атрымаць параду аб тым, як жыць.

Льва Талстога прыцягвалі шчырыя лісты-споведзі простых людзей. Да іх адносіцца і ліст на 42 старонках вучнёўскага сшытка маладой дзяўчыны Агаф'і Цішковай з Магілёўскай губерні, дасланы пісьменніку ў 1910 годзе. Класік слова быў настолькі ўражаны жыццяпісам беларускі, яе адкрытасцю і шчырасцю, што вырашыў даслаць рукапіс ліста для апублікавання разам са сваёй "Прадмовай" у адну з найбольш распаўсюджаных на той час у Расіі газету "Русское слово".

Былі ў Льва Талстога кантакты і з прадстаўнікамі беларускай культуры ды навукі. Больш за 10 гадоў доўжылася перапіска з Мар'янам Здзяхоўскім — ураджэнцам Ракава, вядомым літаратурным дзеячам, прафесарам Кракаўскага і Віленскага універсітэтаў. Быў знаёмы з расійскім пісьменнікам і вядомы беларускі этнограф ды гісторык Мітрафан Доўнар-Запольскі: іх звязвалі агульныя літаратурна-выдавецкія справы.

Пэўны час жыў у Яснай Паляне і выконваў сакратарскія даручэнні С.Беленькі, колішні жыхар Віцебска. Ён займаўся перапісваннем старых і новых твораў Льва Талстога, штодзённа сустракаўся і гутарыў з ім. Вядома, што пісьменнік неаднаразова распытваў яго пра Беларусь, яе гісторыю, культуру і прамысловасць. Ён задаваў пытанні асобна і пра Магілёў, дзе ў свой час спыняўся Аляксандр Пушкін праездам на Каўказ і дзе хацеў пабываць сам у сувязі з працай над раманам "Вайна і мір". У гэтым творы адлюстраваны падзеі, што адбываліся і на беларускай зямлі: трэці том эпапеі пачынаецца з апавядання пра Дрыскі лагер рускай арміі, пра генерала Раеўскага і Магілёўскую зямлю; на Віцебшчыне ж змагаўся Паўлаградскі гусарскі полк, у якім служыў Мікалай Растоў.

Акрамя лістоў, у "Стальным пакоі" захоўваюцца шматлікія тэлеграмы з Беларусі: з Мінскага літаратурна-артыстычнага таварыства, Мінскай гарадской публічнай бібліятэкі імя А.Пушкіна, Бабруйскай публічнай бібліятэкі і інш. У зваротах беларускай грамадскасці з хваляваннем гучалі словы прызнання і падтрымкі: "Вам выпал исключительный удел: подняться на высочайшие вершины сомнений и веры и проникать в глубочайшие бездны человеческого падения в поисках истины...", выказвалася пажаданне, каб пісьменнік і надалей вучыў людзей "тому, как должно и можно жить".

Так сёння выглядае дом у Яснай Паляне, дзе жыў Леў Талстой.

Асобныя беларускія матэрыялы "Стальнога пакоя" экспануюцца сёння ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры на выстаўцы "Жыццё Л.М. Талстога ў фотаздымках сучаснікаў". Акрамя рэдкіх фатаграфій Льва Талстога, яго сям'і, акружэння, у экспазіцыі прадстаўлены прыжыццёвыя выданні, беларускія пераклады і аўтографы.

Леў Талстой пад час прагулкі каля сядзібы ў Яснай Паляне.

У рамках культурна-адукацыйнага праекта адбылася творчая сустрэча прадстаўнікоў літаратурнага музея, бібліятэк і дырэктараў рэспубліканскіх музеяў Мінска з загадчыкам навукова-даследчай лабараторыі "Школа Талстога", дырэктарам музея Л.М. Талстога В.Рэмізавым. Узніміліся пытанні, звязаныя з выяўленнем і перасылкай з Масквы асобных копій дакументаў беларускага паходжання, якія захоўваюцца ў "Стальным пакоі". У сваю чаргу, прадстаўнікі расійскага музея праявілі цікавасць да матэрыялаў нашых архіваў, што звязаны з асобай Льва Талстога. Беларуска-расійскі праект будзе доўжыцца да канца мая. На выстаўцы таксама плануецца дэманстрацыя эксперыментальнага фільма "Таямніцы "Стальнога пакоя", які дазволіць раскрыць загадкі Талстаўіяны, а таксама атрымаць уяўленне пра незвычайнае фондасховішча, дзе змешчана і частка беларускай спадчыны. Даследаванне яе, магчыма, запатрабуе яшчэ не аднаго дзесяцігоддзя.

Ірына ЛАПЦЁНАК,
кандыдат філалагічных навук,
намеснік дырэктара Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры

У беларусаў ёсць прыказка: "Пакуль Бог даў відэлец, ён даў пальцы"... І сапраўды: відэлец чымсьці нагадвае пальцы далоні. Але адкуль і калі да нас прыйшло гэтае звыклае сёння вынаходніцтва?

Трохзубы відэлец шляхціча

Магчыма, самы даўні "продак" сучаснага відэльца паходзіць з глыбокай старажытнасці, нават з каменнага веку. Ён уяўляў з сябе натуральнае разгалінаванне дрэўка ці косткі жывёлы, падпраўленае крамянёвым нажом, і ўжываўся, хутчэй за ўсё, для падсмажвання ежы на адкрытым вогнішчы. Падобныя прыстасаванні захаваліся дзе-нідзе ў культуры некаторых народаў Афрыкі і Акеаніі. Можна сустрэць іх і ў нас, на Беларусі. Прыгадваю сваё дзяцінства, калі налыгаўшы на такі двухрогі дубец лусту хлеба ці кіслы яблык, смажыў іх на вогнішчы…

Самыя старажытныя, вырабленыя з металу, відэльцы знойдзены на паселішчах дзяржавы Асірыі, якая размяшчалася абапал ракі Тыгр у VIII — VII стст. да н. э. Па сваім выглядзе гэтыя відэльцы нагадвалі іклы льва і, верагодней за ўсё, прызначаліся для нейкіх рытуальных дзеянняў, мелі сакральнае значэнне.

Відэльцы, дапоўненыя дэкаратыўнымі дэталямі, часта сустракаюцца ў пахавальных помніках Швецыі. У VII — X стст. н. э. яны ўваходзілі ў склад банкетных набораў нарманаў. Адзін з такіх прыбораў знойдзены і на паселішчы Франапаль Брэсцкай вобласці археолагам Алегам Іовам. Агульная даўжыня гэтага відэльца трохі большая за 9 см, а даўжыня яго зубцоў — 4,5 см. Датуецца ён XI стагоддзем. Гэта пакуль што самы ранні відэлец на Беларусі.

Непасрэдна як сталовы прыбор першы відэлец быў ужыты ў Канстанцінопалі. Ён быў выраблены са срэбра і золата. У XIV — XV стст. відэльцы былі яшчэ прадметам раскошы і сустракаліся толькі ў заможных сем'ях.

У XV — XVI стст., паводле гістарычных звестак, відэльцы з'явіліся ў Італіі. Там яны ўяўлялі з сябе стрыжань, адзін канец якога быў патоўшчаны — у выглядзе ручкі, а другі меў два доўгія зубцы. Дзякуючы такой форме, імі зручна трымаўся кавалак мяса на талерцы і разрэзваўся нажом. У XVI — XVII стст. відэльцы такога выгляду прыйшлі спачатку ў Францыю, а затым і ў Англію.

У XVI ст. гэтыя прыборы трапілі і на тэрыторыю Беларусі. Спрыяла гэтаму тая акалічнасць, што вялікай княгіняй літоўскай на той час была Бона Сфорца, італьянка па паходжанні. Пэўна, яна і прынесла з сабою моду на відэльцы, бо менавіта ў напластаваннях гэтага часу яны і фіксуюцца археолагамі на некаторых раскопках у Беларусі. Паводле выгляду прыборы ўяўлялі з сябе два зубцы, што пераходзілі ў плоскае трыманне, якое абкладвалася тронкамі з косці або высакаякаснага дрэва і мацаваліся да ручкі меднымі заклёпкамі ці штыфтамі. Відэльцы такога кшталту, мабыць, былі прывазныя, хутчэй за ўсё, з Германіі. Уладальнікам такой рэчы мог быць на той час даволі заможны чалавек. Нездарма хто-ніхто са шляхты, каб пусціць пыл у вочы адносна сваёй заможнасці, мусіў насіць відэлец за пасам і выкарыстоўваць яго ў гасцях як адзнаку шыку. Відэльцы такога ўзору знойдзены на Ніжнім замку Віцебска — з касцянымі тронкамі, і ў Лідскім замку — з драўлянымі тронкамі.

У XVII ст. відэльцы мелі дзяржальна ў выглядзе конусападобнага стрыжня, што ўстаўляўся (утыркаўся) у драўляную калодачку-ручку, таму сталовыя прыборы такога кшталту больш дэмакратычныя па тэхналогіі вырабу і маглі належаць больш шырокім колам насельніцтва. (Яны часцей сустракаюцца ў час раскопак у гарадах і замках Беларусі.) Знойдзены яны, напрыклад, у напластаваннях XVII ст. на Верхнім замку Віцебска, замках Міра і Дуброўна, у Мсціслаўлі і Крычаве. Менавіта ў гэты перыяд часу слова "виделець" упершыню фіксуецца ў пісьмовых крыніцах на Беларусі, напрыклад, у Актах Віленскай камісіі. Адзначым, што для Расіі гэты ўзор побытавай культуры быў на той час невядомы. А яго з'яўленне ў Маскве, мякка кажучы, магло выклікаць нядобразычлівае стаўленне да ўладальніка такой рэчы. Так, калі на вяселлі Ілжэдзмітрыя з Марыяй Мнішак літоўска-польская шляхта пачала браць страву з талерак не рукамі, а відэльцамі, дык гэта выклікала гнеў з боку маскоўскіх баяр: паводле іх уяўленняў, гэта былі пальцы нячыстай сілы. З прысутнасцю гэтага сталовага прыбора маскоўскім баярам прыйшлося змірыцца толькі ў часы Пятра I, выхаваннем якога займаўся Сімяон Полацкі.

У XVIII ст. відэльцы пачалі вырабляць ужо трохзубыя. Яны сустракаюцца пад час раскопак у Віцебску, Оршы, Мінску. А ў XIX ст. відэлец набывае сваё сучаснае аблічча: ён становіцца чатырохзубым. Ранні ўзор такога відэльца выяўлены, зноў жа, у Віцебску. У гэты час відэльцы вырабляліся не толькі з жалеза, але з латуні, мельхіёра і нават срэбра.

Мяркуючы па археалагічных даных і сведчаннях людзей, відэльцы доўгі час заставаліся выключна гарадскім атрыбутам застолля. На вёску яны прыйшлі толькі ў пасляваенны час. Калі сялянскую хату наведваў шаноўны госць, гаспадыня даставала відэлец, працірала яго ручніком і падавала госцю, выказваючы гэтым пашану.

Леанід КАЛЯДЗІНСКІ,
археолаг

На ілюстрацыях: відэльцы XVI — XVIII стст. з Оршы, Мсціслава, Віцебска.

Кінематограф заставаўся "важнейшым з мастацтваў" нават у гады Вялікай Айчыннай вайны. Звычайна кінаапаратура і фільмы дасылаліся ў партызанскія фарміраванні з Вялікай зямлі. Але былі выпадкі, калі змагары выкарыстоўвалі кінаперасоўкі, што засталіся яшчэ з даваеннага часу. Напрыклад, у верасні 1941 года партызаны Палескай вобласці разграмілі варожы гарнізон у раённым цэнтры Лельчыцы і на працягу двух тыдняў утрымлівалі яго. У гэтыя дні ў мясцовым клубе была арганізавана дэманстрацыя савецкіх фільмаў. А восенню 1941 г., у час наступлення гітлераўскіх войскаў на Маскву, у іхнім глыбокім тыле ў вёсках Быхаўскага і Прапойскага (цяпер — Слаўгарадскага) раёнаў Магілёўскай вобласці, партызанская кінаўстаноўка дэманстравала фільм пра разгром нямецкіх рыцараў на Чудскім возеры. Як клятва, як заклік да змагання гучалі з экрана словы Аляксандра Неўскага: «Але калі хто з мячом да нас прыйдзе — ад мяча і загіне!»

"Пад час дэманстрацыі фільма людзі плакалі ад радасці..."

"Вокам" партызанскай перасоўкі

С.Жарнасекаў. За ўдзел у партызанскім руху, кінаабслугоўванне партызан і насельніцтва ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Хто стаў першым ваенным кінамеханікам?

Здараліся выпадкі, калі асобныя патрыёты хавалі кінаперасоўкі, што засталіся з даваеннага часу, каб перадаць іх партызанам. Напрыклад, жыхарка вёскі Млынок Капаткевіцкага раёна Палескай вобласці З.Жарнасекава, муж якой працаваў да вайны ў Капаткевічах кінамеханікам, схавала ад фашыстаў яго апаратуру. Пра гэта даведаліся ворагі. Некалькі разоў яны рабілі ў яе доме вобыск, пагражалі сям'і расстрэлам, але нічога не знайшлі. У 1943 г. Зінаіда Іванаўна перадала перасоўку ў партызанскі атрад імя Міхайлоўскага.

Вядома, што ў пачатку вайны ніхто нават і марыць не мог пра кіно. Але, калі летам 1942 года мелі больш-менш рэгулярную сувязь з Вялікай зямлёй, атрады Віцебскай вобласці звярнуліся ў Беларускі штаб партызанскага руху з просьбай прысылаць кінаперасоўку. Нягледзячы на тое, што было даволі небяспечна збіраць пад адным дахам шмат партызан і камандзіраў, просьбу задаволілі. У чэрвені 1942 года да іх прыбыў з кінаперасоўкай і дакументальнай стужкай "Разгром нямецкіх войскаў пад Масквой" кінамеханік С.Жарнасекаў.

Нягледзячы на павелічэнне выдаткаў на абарону і строгі рэжым эканоміі, СНК СССР у 1942 годзе выдзеліў на стварэнне кіначасопіса і набыццё кінаперасовак для абслугоўвання партызан і насельніцтва акупіраванай тэрыторыі Беларусі 343 тысячы рублёў. На гэтыя сродкі Упраўленне кінафікацыі БССР наладзіла штомесячны выпуск кіначасопіса "Савецкая Беларусь", набыло некалькі перасовак, стужак, падрыхтавала групу механікаў для работы ў варожым тыле.

У партызанскія зоны Беларусі з Вялікай зямлі накіроўваліся аператары-дакументалісты. У 1943 г. у Полацка-Лепельскую зону прыбылі кінааператары М.Пісараў, А.Рэйзман, М.Сухава, С.Школьнікаў. Яны здымалі баявыя эпізоды, побыт партызанаў і насельніцтва, удзельнічалі ў баявых аперацыях. Кінакадры, адзнятыя М.Сухавай, увайшлі ў фільмы «Народныя мсціўцы», «Вызваленне Савецкай Беларусі», «Вялікая Айчынная», «Дарога без прывалу».

У студзені 1943 г. СНК БССР накіраваў у тыл ворага трох кінамеханікаў — В.Феакцістава, Г.Максімава і Д.Нікалаенку — з перасоўкамі і фільмамі для работы ў партызанскіх фарміраваннях. Такім чынам, на Віцебшчыне аказаліся адна гукавая перасоўка са стужкамі "Сакратар райкама", "Канцэрт фронту", чатырма кіначасопісамі "Савецкая Беларусь", карцінай пра разгром нямецкіх войскаў пад Сталінградам, а таксама тры перасоўкі для нямых фільмаў. Разам з імі прыбылі карціны "Ленін у кастрычніку", "Пётр Першы", "Чапаеў", "Памылка інжынера Кочына", "Юнацтва Максіма", "Вяртанне Максіма" і 10 кіначасопісаў.

Пяць перасовак былі накіраваны ў Мінскую, Магілёўскую, Вілейскую, Палескую вобласці і Слуцкі раён. Мінскі штаб партызанскага злучэння атрымаў дзве кінаўстаноўкі і некалькі фільмаў, якія дэманстраваліся для партызан і насельніцтва Любанскага, Слуцкага, Старадарожскага, Мінскага, Барысаўскага, Старобінскага, Капыльскага, Грэскага, Чырвонаслабодскага, Рудзенскага і Чэрвеньскага раёнаў. Было запланавана даслаць у тыл ворага яшчэ дзесяць і стварыць рэзерв з пяцідзесяці кінапера-совак.

Факт з'яўлення савецкіх фільмаў на часова акупіраванай фашыстамі тэрыторыі Беларусі адзначала газета "Савецкая Беларусь": "...З радасным хваляваннем сустракаюць партызаны і насельніцтва акупіраваных раёнаў Беларусі прыбыццё кінаперасовак, якія дэманструюць савецкія кінафільмы".

Для дэманстрацыі ў тыле ворага падбіраліся фільмы патрыятычнага зместу. З поспехам дэманстраваліся кіначасопісы «Савецкая Беларусь». У 10-хвілінных выпусках часопіса змяшчаліся рэпартажы з франтоў Вялікай Айчыннай вайны, расказвалася пра гераічныя подзвігі воінаў-беларусаў, самаадданую працу нашых землякоў у савецкім тыле, дзейнасць народных мсціўцаў. У кіначасопісах і кароткаметражных кінаборніках выкрываліся зверствы фашыстаў на савецкай зямлі, іх чалавеканенавісніцкая ідэалогія.

Фільм, агучаны ў атрадзе

Аб тым, якое ўздзеянне аказваў паказ савецкіх фільмаў, распавядаў адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Любанскім раёне А.Баравік. "У нас на востраве Зыслаў пабудаваны аэрадром, куды прыляталі і прызямляліся савецкія самалёты, што прывозілі партызанам узбраенне, боепрыпасы, газеты, лістоўкі... Разам з гэтым грузам з Вялікай зямлі былі дастаўлены кінаапараты і кінакарціны. Да кінаапаратаў дадаваліся дынамамашыны, якія трэба было круціць уручную, у выніку чаго выраблялася электраэнергія, што давала магчымасць дэманстраваць фільмы.

Кінаапарат і тры кінафільмы — "Разгром нямецкіх войскаў пад Масквой", "Ленін у Кастрычніку", "Хлопец з нашага горада" — мы атрымалі ў Мінскім штабе партызанскага руху. Кіно дэманстравалі для партызан — у лясных лагерах, а таксама для насельніцтва — у вёсках. Каб ажыццявіць паказ кінакарцін у вёсках, мы выстаўлялі па ўсіх дарогах вакол гэтых населеных пунктаў баявую ахову. Перад кіно праводзіліся палітінфармацыі, зачытваліся зводкі Совінформбюро. Як правіла, на кінасеансы прыходзілі ўсе, хто мог, — ад старога да малога. Пад час дэманстрацыі кінакарціны людзі плакалі ад радасці".

Аб дэманстрацыі кінафільмаў у тыле ворага пакінуў успаміны кінамеханік 12-й кавалерыйскай брыгады І.І. Насевіч: "У нас была "нямая" кінаўстаноўка і тры кінафільмы "Чапаеў" з дадаткам кіназборніку "Чапаеў у Айчыннай вайне", "Разгром нямецкіх войскаў пад Масквой" і "Хлопец з нашага горада". Кінафільм "Хлопец з нашага горада" быў прызначаны для нямога кінапаказу і меў цітры, якія я чытаў услых у час дэманстрацыі фільма. Астатнія кінастужкі надпісаў не мелі, і тэкст даводзілася прыдумляць самому, балазе да вайны працаваў настаўнікам гісторыі. У атрадзе быў баяніст, якога я запрашаў для музычнага суправаджэння фільмаў. Па ходзе дзеянняў, што адбываліся на экране, ён цічэнька найграваў музычныя мелодыі, быццам агучваючы кінафільм.

Першым фільмам, паказаным мною, быў "Чапаеў". Ён дэманстраваўся ў брыгадным шпіталі па просьбе параненых партызан. Замест экрана мы выкарыстоўвалі звычайную прасціну. Бачачы на экране праслаўленага героя грамадзянскай вайны В.І. Чапаева, партызаны плакалі ад радасці. А калі пачаў дэманстравацца кіназборнік "Чапаеў у Айчыннай вайне", параненыя з воклічам: "Бі іх, Васіль Іванавіч!" — пачалі ўскокваць з ложкаў. Кінакадры, у якіх паказвалася, як Чапаеў знішчае фашыстаў, давялося паўтараць некалькі разоў. Вестка пра кіно хутка распаўсюдзілася сярод партызан і грамадзянскага насельніцтва. Камандзіры атрадаў патрабавалі паказаць кіно ў іх атрадах. Фільмы пачалі сістэматычна дэманстравацца ва ўсіх атрадах брыгады, у суседніх партызанскіх брыгадах і вёсках Краснаслабодскага раёна".

Кіно — пад аховай

У летні перыяд фільмы дэманстраваліся ў лесе або ў калгасных свірнах, дзе магла сабрацца вялікая колькасць людзей. Зімой для гэтай мэты выбіралі звычайна самую вялікую хату ў вёсцы. Партызаны надзейна ахоўвалі населеныя пункты, дзе адбываліся прагляды. Часта пасля сеансаў арганізоўвалі мітынгі. Напрыклад, пасля дэманстрацыі кінафільма "Чапаеў" у вёсцы Буда Лунінецкага раёна адбыўся мітынг, на якім партызаны, што ішлі на баявое заданне, далі клятву выканаць яго па-чапаеўску.

Былы камандзір атрада 3-й Беларускай партызанскай брыгады, якая дзейнічала на Віцебшчыне, І.А. Котаў успамінае: "У жніўні 1942 года ў атрад прыбыла з брыгады кінаперасоўка. Партызаны дапамаглі перанесці апаратуру ў атрад. Першы сеанс кінакарціны "Разгром нямецкіх войскаў пад Масквой" быў паказаны ў атрадзе. Усе гледачы апладзіравалі нашым доблесным воінам.

Камандаванне вырашыла паказаць фільм насельніцтву вёсак Залессе і Узніцы. На ўскрайку вёскі Залессе, у хляве, паставілі апаратуру. Вакол выставілі ахову (за два кіламетры быў варожы гарнізон). У кіно сабраліся ўсе жыхары вёскі — і старыя, і малыя. Яны былі па-святочнаму апрануты, адчуваліся падцягнутасць і дысцыплінаванасць.

Перад пачаткам сеанса кінамеханік С.В. Жарнасекаў расказаў пра становішча на франтах... У час дэманстрацыі карціны ўсе неяк забыліся, што жывуць сярод немцаў, што ў кожную хвіліну ім пагражае смерць. Пасля кінафільма гледачы ўсміхаліся і ажыўлена размаўлялі".

Колькі было ваенных кінасеансаў?

Устанавіць колькасць кінасеансаў, праведзеных на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, немагчыма, бо такі ўлік не вёўся. Але нават асобныя факты сведчаць аб тым, што, нягледзячы на цяжкія ўмовы акупацыі, у тыле ворага была праведзена значная колькасць кінапаказаў, на якіх прысутнічалі дзесяткі тысяч партызан і насельніцтва рэспублікі. У другой палове 1942 года стужка "Разгром нямецкіх войскаў пад Масквой" дэманстравалася для партызанаў і насельніцтва Віцебскай вобласці каля трохсот разоў. Яго прагледзела звыш 50 тысяч чалавек. У Мінскай вобласці за гады Вялікай Айчыннай вайны было наладжана 2000 кінасеансаў, на якіх прысутнічала 178 тысяч чалавек. Толькі ў вёсцы Вялікі Радзівон Баранавіцкай вобласці на паказ кінастужкі "Хлопец з нашага горада", што адбыўся ў першамайскія дні 1944 года, сабралася каля дзвюх тысяч жыхароў з навакольных вёсак.

Беларускія кінамеханікі дэманстравалі фільмы не толькі для партызанаў і насельніцтва сваёй рэспублікі, але і для народных мсціўцаў Украіны. Зімой 1943 года на Беларускае Палессе прыбыла дывізія партызанскага злучэння С.А. Каўпака. Калі там даведаліся, што ў мясцовых партызанаў ёсць кінаўстаноўка і савецкія фільмы, камандзір дывізіі П.П. Вяршыгара звярнуўся да камандавання 12-й кавалерыйскай брыгады з просьбай паказаць фільмы ўкраінскім партызанам. Да каўпакоўцаў быў накіраваны кінамеханік І.І. Насевіч, які цягам месяца абслугоўваў кінасеансамі ўсе палкі дывізіі.

Савецкія кінафільмы разам з іншымі сродкамі культурна-дасугавай дзейнасці адыгралі вялікую ролю ў ідэалагічным выхаванні партызан і мірнага насельніцтва. Гэта былі вымушаны прызнаць і самі фашысты. Генерал фон Бах, адзначаючы высокі баявы і маральны дух партызан Віцебшчыны, пісаў: "Настрой... бандытаў (Так ён называў партызанаў. — **А.П.**) Расонскай зоны можна ахарактарызаваць як паўсюдна добры. Ён умела падтрымліваецца з дапамогай кінафільмаў, радыёпрапаганды, лістовак і вуснай прапаганды. Поспехі Чырвонай Арміі прапагандуюцца ўсімі даступнымі сродкамі. Так, нядаўна нам удалося захапіць кінафільм пра абаронцаў Сталінграда, які, без сумнення, зрабіў сваё ўздзеянне..."

Цяжкасці ваеннага часу не дазволілі наладзіць кінаабслугоўванне партызанаў і насельніцтва ва ўсіх абласцях рэспублікі. Яно было арганізавана толькі ў Баранавіцкай, Віцебскай, Мінскай і Палескай абласцях — там, дзе партызанскі рух быў больш распаўсюджаны і мелася надзейная авіясувязь з Вялікай зямлёй. Самая значная колькасць кінаперасовак працавала на Віцебшчыне. Гэтаму садзейнічалі адносна спрыяльныя ўмовы для пранікнення ў тыл ворага: блізкасць фронту і існаванне ў 1942 г. Віцебскіх варот. Кіно ва ўмовах акупацыі выкарыстоўвалася менш шырока ў сувязі з цяжкасцямі дастаўкі, асаблівасцямі тэхнікі дэманстрацыі, адсутнасцю апаратуры, кінаплёнак, запасных частак. Стужкі дэманстраваліся, у асноўным, у партызанскіх атрадах і злучэннях, а таксама для насельніцтва, якое пражывала ў партызанскіх зонах.

Аляксандр ПАЦЫЕНКА,
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт Беларускага дзяржаўнага
універсітэта культуры і мастацтваў

АК Афіша "К"

з 2 мая — да 8 мая 2009

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РБ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 227 45 62.

■ Мастацтва Беларусі XII — XIX стст.
■ Мастацтва Беларусі канца XIX — пач. XXI стст.
■ Мастацтва Расіі XVIII — пачатку XX стст.
■ Мастацтва краін Усходу XV — XX стст.
■ Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.
■ Выстаўка **"Мікалай Гогаль і яго героі ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"**.
■ Персанальная выстаўка М.Аўчыннікава **"Блізкае і далёкае"**.
■ Выстаўка **"Алтарны жывапіс XVIII — XIX стст."**.
■ Выстаўка лётчыка-касманаўта, двойчы Героя Савецкага Саюза Аляксея Ляонава.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея РБ:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст.".

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 227 87 96.

■ Выстаўка фотаздымкаў XIX ст.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. Тэл.: (8–01596) 2 30 35.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА ў в.Раўбічы

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі р-н. Тэл.: 507 44 68.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка дзіцячай творчасці.

МУЗЕЙ ВІТОЛЬДА КАЭТАНАВІЧА БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ ў г.МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 227 43 22.

Экспазіцыі:
■ **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пачатку XX стст."**.
■ **"Старажытная Беларусь"**.
■ **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы"**.

Выстаўкі:
■ **"Гісторыя мастацтва Ірана"**.
■ **"Скарбніца мудрасці"**.
■ **"Усмешка клоуна"**
■ **"Пластыка жывой прыроды"**.
■ **"Крыніцы адвечнай прыгажосці"**.
■ **"Касцярэзнае рамяство Беларусі"** *(з фондаў Нацыянальнага музея гісторыі і культуры).*

Дом-музей І з'езда РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

■ Пастаянная экспазіцыя **"Гісторыя І-га з'езда РСДРП"**.
■ Выстаўка **"Чароўныя лялькі"**.

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 72 61.

Выстаўкі:
■ Выстаўка, прысвечаная 85-годдзю А.Савіцкага.
■ Выстаўка вышыўкі **"Вясновая рапсодыя"**.
■ **"Хата — мой сусвет"**.
■ **"Жыццё Л.М. Талстога ў фатаграфіях сучаснікаў"**.
■ Выстаўка музейных прадметаў XI — XX стст. з фонду музея **"Вякоў мінулых успамін..."**.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
■ **"Адам Міцкевіч на паштоўцы к. XIX — п. XX стст."**.
■ **"Белая ружа" (Антыфашысцкае супраціўленне нямецкіх студэнтаў-медыкаў у Мюнхене. 1942 — 1943 гг.)**.
■ **"Мінск: вандроўка ў часе"** — на аснове філакартычнай калекцыі У.Ліхадзедава.

Праект інтэрактыўнай карты: **"Вызваленне Беларусі"** *(хроніка вызвалення і мультымедыйная прэзентацыя аперацый Чырвонай Арміі па вызваленні Беларусі ў верасні 1943 — ліпені 1944 гг.).*

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11. Цэнтральная частка палаца Румянцавых і Паскевічаў

Выстаўкі:
■ **"Прыгажосць душы — рукачынная"** *(да 70-годдзя гомельскай фабрыкі "Любна")*.
■ **"Усходняя каліграфія і каліграфічны жывапіс"**.
■ **"Жывое жалеза"** (металічныя скульптуры С.Парцянкова).
■ **"Выбранае"** — выстаўка В.Пачыцкага.
■ **"Пратакольныя падарункі"**.
■ **"Нараджэнне і адраджэнне"** (архітэктура Гомельскага палаца ў выяўленчых крыніцах).
■ **"Паэзія роднага пейзажу"** — выстаўка работ мастака С.Драмука.

Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"**.
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"**.
■ **"Загадкавыя фантазіі мора"** *(грот палаца)*.
■ Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.

Вежа палаца Румянцавых і Паскевічаў

Гісторыка-мемарыяльная экспазіцыя
■ **"Гравюра XVII — пачатку XX стст."**.
■ **"Паэзія XVIII — пачатку XX стст."**.

Паўночнае крыло палаца

Зімовы сад
■ **"Сум і зачараванне правінцыі"** (выстаўка польскага фатографа Ежы Пёнтэка).
■ Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Лакальныя экспазіцыі ў санітарным вагоне; у партызанскай зямлянцы.
■ Пастаянная выстаўка ваеннай тэхнікі.
■ На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
■ У выставачнай зале: **"Афганістан: ты наша памяць і боль"**.

ГАЛЕРЭІ*

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс: 290 60 10.

■ **Персанальная выстаўка Г.Грака.**
■ **Персанальная выстаўка П.Паршына.**
■ **Выстаўка работ В.Цвіркі.**

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1 (Палац Рэспублікі). Тэл.: 227 26 12.

■ **"Мартаўскія каты"**.

ГАЛЕРЭЯ ТЫЗЕНГАУЗА

г. Гродна, пл. Тызенгауза, 4. Тэл./факс: (8–0152) 72 27 57.

■ Выстаўка гродзенскіх мастакоў.

КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ Г.ВАШЧАНКІ

г. Гомель, вул. Карповіча, 4. Тэл.: (8-0232) 77 75 20.

Экспазіцыі:
■ **"Г.Х. Вашчанка"**.

Выстаўкі:
■ Выстаўка **"Жалезная гісторыя"**.
■ Персанальная выстаўка Валерыя Калтыгіна.
■ Выстаўка **"Выдатныя ліхвяры"**.

Выстаўкі:
■ **"У ценю дрэваў, над ракой"** *(фотаздымкі птушак і вавёрак Гомельскага парку фотааматара Яўгена Шастакова)*.
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.
■ Працуе куток жывых экзатычных рэптылій.

Паважаныя чытачы!

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ 2009 ГОДА!

на газету "Культура"
Падпісныя індэксы:
індывідуальная падпіска — 63875,
ведамасная падпіска — 638752;

на часопіс "Мастацтва"
Падпісныя індэксы:
індывідуальная падпіска — 74958,
ведамасная падпіска — 749582.

ТЭАТРЫ*

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, тэл./факс: 334 11 56. (пл. Парыжскай каммуны, 1)

■ **Тэатр знаходзіцца на гастролях.**

РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. тэл./факс: 334 60 08.

■ **4 — "Адвечная песня"** Янкі Купалы
■ **5 — "Раман+Юлія"** Д.Балыка.
■ **6 — "Каласы пад сярпом тваім"** У.Караткевіча.
■ **7 — "Жанчыны Бергмана"** М.Рудкоўскага.
■ **8 — "Сталіца Эраунд"** С.Гіргеля.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **2 — "Брэменскія музыкі"** В.Ліванава, Ю.Энціна.
■ **3, 5 — "Казка пра Ямелю"** Я.Тарахоўскай.
■ **8 — "Дапытлівы слонік"** Р.Кіплінга.

МАЗЫРСКІ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР ІМЯ І.МЕЛЕЖА

г. Мазыр, вул. Ленінская, 23. Тэл.: (8–02351) 211 31.

■ **2, 3 — "Пецярбургскі ліхвяр"** М.Някрасава.
■ **7 — "Трыбунал"** А.Макаёнка.

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 418
Галоўны рэдактар — Людміла КРУШЫНСКАЯ

Рэдакцыйная калегія:
Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Уладзімір ЗАМЯТАЛІН, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Аляксандр РАШЧУПКІН, Барыс СВЯТЛОЎ, Рычард СМОЛЬСКІ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя:
Сяргей ТРАФІЛАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Пётр ОВАД (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў:
Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілля СВІРЫН.

Спецкарэспандэнты:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Наталля КІРПІЧЭНКАВА, Настасся ПАНКРАТАВА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр.Незалежнасці,77.
Тэлефон: (017) 289-34-66 (прыёмная) (017) 286-07-97,
Тэлефон/факс: (017) 334-57-23 (017) 334-57-35.
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334-57-41
www.kimpress.by
E-MAIL: kultura@tut.by

Выдавец — **Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"**
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0131892 ад 27 снежня 2006 г.
220013, Мінск, пр.Незалежнасці, 77. Тэл. (017) 289-34-66. Бухгалтэрыя: тэл. (017) 334-57-35

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца работы, зваротны адрас. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
***Матэрыял на правах рэкламы.**

© "Культура", 2009.

Індэкс 63875
Наклад 9275
Падпісана ў свет 29.04.2009 у 16.30
Замова 2317
РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". 220013, г.Мінск, пр.Незалежнасці, 79

ISSN 1994-4780